ПРАЛЕТАРЫ ВСЯХ КРАЁЎ, ЛУЧАЙЦЕСЯ!

ЗЬВЯЗДА

№ 131 (3239) Серада, 12-га Чэрвеня 1929 г.

Орган Цэнтральнага і Менскага Камітэтаў Камуністычнай Партыі (б) Беларусі.

Адрас рэд. і канторы: Менск, Савецкая, 63
ШТОДЗЕННАЯ ГАЗЭТА, ГОД ВЫДАНЬНЯ XIII
Тэлефоны: рэдактар—1074, сакратар—619, кантора—781

ЛЕНІНГРАД, 11. Геалёгічны камітэт атрымаў паведамленьне, што каля Лысьвенскага заводу, ў 60 кіл. ад Чусоўскіх Гарадкоў, выяўлена месцанараджэньне бітамінозных далямітаў. Гэта паказвае, што на заходнім схіле Урала акрамя ўжо вядомых месцанараджэньняў нафты ёсьць і іншыя і што Чусоўскі раён зьяўляецца толькі часткаю вельмі вялікае нафтаноснае воблясьці

АПОШНІЯ НАВІНЫ **Б. С. С. Р.**

Гэтымі днямі пушчаны ў ход Мсьціслаўскі фасфарытны млын, першае ў Беларусі прадпрыемства па вырабе ўгнойваючым фасфарытных тукаў. Адначасова пачынаецца будаўніцтва вялікага Крычаўскага фасфарытнага заводу і невялікага Клімавіцкага фасфарытнага млыну.

ПЛЯН ЮНГА

Першае адрозьненьне пляну Юнга ад пляну Даўэса заключаецца ў адрозьненьні гадавога плацяжу Нямеччыны. Згодна пляну Даўэса, пачынаючы з першага году дзейнасьці гэтага пляну (г. зн. іменна з бягучага году), плацяжы Нямеччыны выражаліся ў суме 2 мільярдаў 500 мільёнаў залатых марак, згодна-ж парыскаму дагавору, гадавая сума зьніжана для першых 37 год да 1 мільярду 988 мільёнаў 800 тысяч залатых марак. Такім чынам, першы вывад, які трэба зрабіць, заключаецца ў тым, што гадавыя плацяжы Нямеччыны зьніжаны больш чым на 500 мільёнаў марак у год.

Ці зьяўляецца гэта перамогаю нямецкіх дэлегатаў? Здавалася-б, адказ ясны. Нямеччыне прыдзецца штогод плаціць на 500 мільёнаў марак менш. Было-б, аднак, няправільна абмежавацца такім чыста арытмэтычным вывадам. Нельга забываць, што ў момант пачатку перагавораў у Парыжы, на пятым годзе функцыянаваньня пляну Даўэса, зрабілася відавочнай ісьцінай немагчымасьць доўгага выкачваньня з нямецкае народнае гаспадаркі такой вялізарнай сумы рэпарацыйных узносаў.

Перад нямецкімі крэдытарамі паўстала пытаньне аб паралюшы пляну Даўэса. Замест яснага і нядвусэнснага адмаўленьня Нямеччыны ад належных з яе плацяжоў, саюзьнікі атрымалі новае пацьверджаньне з боку Нямеччыны аб яе гатоўнасьці і ў далейшым плаціць штогодную даніну, хоць-бы зьменшаную на адну пятую.

Другім адрозьненьнем пляну Юнга ад пляну Даўэса зьяўляецца фіксацыя як поўнае сумы ўсіх рэпарацый, так роўным чынам і фіксацыя канчатковага тэрміну іх выплаты. Гэты тэрмін, як вядома, вызначан у 59 год, прычым, падзелен на дзьве часткі на першыя 37 год і наступныя 22 гады.

В 1919-20 г. сума нямецкіх рэпарацый складала 250 мільярдаў залатых марак. На Лёндонскай канфэрэнцыі ў 1921 годзе, гэта сума была зьніжана да 132 мільярдаў марак. На Парыскай і Лёндонскай канфэрэнцыях ў 1923 годзе сума гэта была зьніжана да 50 мільярдаў марак. Плян Юнга зафіксаваў як агульную суму, так і тэрмін яе выплаты. Пры гэтым, агульная сума зафіксавана на ўзроўні ніжэйшым (калі ня лічыць процанты) чымся апошняя з названых лічбаў. Такім чынам, і ў гэтым пытаньні, здавалася-б, можна гаварыць аб выйгрышы для нямецкае народнае гаспадаркі.

Аднак, і гэта заключэньне было-б няправільным. Вядома, што прадстаўнікі нямецкае народнае гаспадаркі зусім ня імкнуліся да фіксацыі ні канчатковае сумы, ні тэрмінаў яе выплаты. Гэта зразумела, бо няўстойлівая гаспадарчая і палітычная кан'юнктура магла дазволіць Нямеччыне праз некалькі год зусім пазбавіцца ад рэпарацыйнага доўгу. Цяпер гэта будзе значна цяжэй, паколькі ёсьць згода Нямеччыны плаціць на працягу 59 год. На працягу першых 37 год нямецкія рэпарацыйныя плацяжы ідуць на пакрыцьцё ваенных страт крэдытораў і на плацяжы на міжсаюзных даўгох. На працягу апошніх 22-х год Нямеччына абавязваецца забясьпечыць дзяржавам-крэдыторам пагашэньне іх доўгу ПАЗШ.

Па сутнасьці Нямеччына, стала адзіным даўжніком ПАЗШ, у той час, як Англія і Францыя засталіся ў ролі перадатачных інстанцый па выплаце гэтай запазычанасьці. Плян Юнга, пры некаторай выгадзе для Нямеччыны, ўсё-ж прадстаўляе значна больш сур'ёзныя і бясспрэчныя выгады для вэрсальскіх пераможцаў, з аднаго боку і ПАЗШ з другога, пры тым, за кошт Нямеччыны.

Эфэктыўным палітычным дапаўненьнем да пляну Юнга будзе эвакуацыя Рэйну. Гэта эвакуацыя (калі яна будзе праведзена) для Нямеччыны мае вялікае палітычнае значэньне. Аднак, калі ўспомніць, што гэта эвакуацыя ў аднэй частцы павінна мець месца ўжо ў 1930 годзе, а поўнасьцю—у 1935 годзе, дык каштоўнасьць гэтага «палітычнага дабаўленьня» акажацца значна зьніжанай.

Нямецкі буржуазны друк, уключаючы «Форвэртс», але выключаючы друк нацыяналістых, сустрэў парыскую згоду хорам добранажаданых водгукаў. Мы ня сумняваемся, што бліжэйшыя дні прынясуць пэўнае працьвярожаньне ў гэтым пытаньні. Падобная цьвярозасьць дапаможа нямецкай грамадкасьці крыху больш спакойна падыйсьці да ацэнкі вынікаў парыскае ўмовы і ўбачыць яе сапраўдныя контуры.

(«ИЗВЕСТИЯ»).

БЭРЛІНСКІЯ ЗАБОЙЦЫ РЫХТУЮЦЬ НОВУЮ ПРАВАКАЦЫЮ

САЦЫЯЛ-ЦЭРГІБЭЛІ ЗНОЎ НАМЕРАНЫ АРГАНІЗАВАЦЬ КРЫВАПУСКАНЬНЕ БЭРЛІНСКІМ РАБОЧЫМ У ДЗЕНЬ 1-га ЖНІЎНЯ.—ПАДРЫХТОЎКА РОСПУСКУ НЯМЕЦКАЕ КАМПАРТЫІ

ВЫКРЫЦЬЦІ т. ГЭКЕРТА НА ЗЬЕЗЬДЗЕ НЯМЕЦКАЕ КАМПАРТЫІ

БЭРЛІН, 10. На ранішнім пасяджэньні зьезду нямецкае кампартыі ў панядзелак, з прывітальнымі прамовамі выступілі прадстаўнікі кампартый Швайцарыі, Швэцыі, Міжрабпому. Былі зачытаны шматлікія тэлеграмы і лісты ад рабочых, ад масавых арганізацый і ад левых рэвалюцыйных фракцый прафсаюзаў. Потым з дакладам ад імя мандатнае камісіі выступіў т. Гэкерт.

Пры напружанай увазе ўсяе залі тав. Гэкерт агаласіў, між іншым, ліст аднаго з дэлегатаў Магдэбургскага зьезду сацыял-дэмакратычнае партыі. Аўтар гэтага лісту, член сацыял-дэмакратычнае партыі, заяўляе, што **ён цалкам згодзен з тактыкаю камуністычнае партыі і абураецца плянамі сацыял-дэмакратычных лідэраў; гэтыя пляны ён называе правакацыйнымі;** іх характар поўнасьцю выявіўся на сакрэтнай нарадзе, што адбылася 29-га мая, пра якую расказвае аўтар лісту. Нарада гэта была прысьвечана пытаньню аб скасаваньні забароны дэманстрацый у Бэрліне; у нарадзе прымалі ўдзел лідэры сацыял-дэмакратычнае партыі Вэльс, Фогель, Зольман і інш., а таксама бэрлінскі паліцэй-прэзыдэнт Цэргібэль.

Удзельнікі нарады прымушаны былі прызнаць, што пасьля крывавых майскіх падзей, сацыял-дэмакратыю падтрымаў толькі правы друк. Нарада прызнала, што трэба скасаваць забарону дэманстрацый, абвясьціўшы скасаваньне якой-небудзь «штучнай» матывіроўкаю. Цэргібэль таксама выказаўся за скасаваньне забароны, заяўляючы, што «толькі тады камуністычная партыя будзе прымушана ўступіць у бой з паднятым забралам».

Паводле слоў Цэргібэля, у будучым, пры дэманстрацыях няўхільны сутычкі паміж дэманстрантамі і паліцыяй і можна будзе ўжываць «больш суровыя ўчынкі ў адносінах хоць да камуністычнае партыі».

Зольман пераконваў, што сацыял-дэмакраты для правядзеньня сваей палітыкі ва ўрадзе, адчуваюць патрэбу «у свабодзе ад перашкод зьлева» і на гэтай падставе патрабаваў роспуску камуністычнае партыі, які, паводле яго слоў, «трэба падрыхтаваць больш хітра, як гэта была падрыхтавана забарона дэманстрацый».

Выкрыцьці гэтыя зьезд спаткаў з вялікім абурэньнем.

Характарызуючы сэнс выкрыцьцяў, тав. Гэкерт падкрэсьліў, **што палітыка сацыял-дэмакратычных лідэраў дайшла да апошняй ступені падзеньня і што сацыял-дэмакраты рыхтуюць новае крывапраліцьце ў дзень 1-га жніўня.**

ДАКЛАД т. ТЭЛЬМАНА

БЭРЛІН, 10. На зьезьдзе нямецкае кампартыі з дакладам аб палітычным становішчы і задачах партыі выступіў тав. Тэльман, якога зьезд спаткаў гучнымі воплескамі, рэплікамі ў гонар СССР і пляньнем «Інтэрнацыяналу».

МАБІЛІЗАЦЫЯ МАС ДА МІЖНАРОДНАГА ЧЫРВОНАГА ДНЯ

БЭРЛІН, 6. Кампартыя Нямеччыны прыняла меры, каб зрабіць міжнародны чырвоны дзень—днём барацьбы самых шырокіх рабочых мас горада і вёскі супроць імпэрыялістычнае вайны і за абарону СССР.

Мабілізацыя мас праводзіцца ў самай цеснай сувязі з штодзённай барацьбою кампартыі Нямеччыны супроць кааліцыйнага ўраду супроць сацыял-фашызму і сацыял-імпэрыялізму, супроць існуючай сыстэмы трэцейскага разгляду спраў, супроць штрэйбрэхерскае і раскольніцкае тактыкі рэфармістых.

НАГЛАЯ ЗАЯВА ЗЭВЭРЫНГА

БЭРЛІН, 7. Зэвэрынг выступіў у Касэлі з дакладам, у якім падрабязна спыніўся на барацьбе дзяржавы супроць камуністычнага руху. «Той,— заявіў Зэвэрынг,—хто са зброяй у руках і пры дапамозе чужаземнае ўлады хоча загубіць нямецкі народ, той зьяўляецца ўнутраным ворагам і супроць яго трэба змагацца ўсімі сродкамі, што мае ў сваім распараджэньні дзяржава».

Першыя крокі ўраду каралеўскіх „сацыялістых“

КАНЧАТКОВЫЯ ВЫНІКІ ВЫБАРАЎ

ЛЁНДАН, 10. Апублікаваны канчатковыя вынікі выбараў у палату вобшчын. Невядомым застаецца толькі вынік выбараў у выбарчай акрузе Рэгбі, дзе выбары адкладзены да 13-га чэрвеня з прычыны сьмерці кандыдата рабочае партыі, які памёр за некалькі дзён да ўсеагульных выбараў.

Рэшта 614 мандатаў разьмяркоўваюцца ў палаце вобшчын так: рабочая партыя—288 мандатаў, кансэрватары—259, лібэралы—58, беспартыйныя—9.

СНОЎДЭН ЗАКЛІКАЕ ЛІБЭРАЛАЎ ДА СУПРАЦОЎНІЦТВА З УРАДАМ

ЛЁНДАН, 10. Міністр фінансаў Сноўдэн у чарговым артыкуле ў органе каапэрацыйнага руху «Рэйнольд» заклікае лібэралаў не пастойваць на рэформе выбарчага права, але папярэдня дапамагчы ўраду рабочае партыі ў яго непасрэдных і больш важных задачах, як, напрыклад, пытаньне аб беспрацоўі.

МАКДАНАЛЬД МАЕ НАМЕР ПАЕХАЦЬ У АМЭРЫКУ

ЛЁНДАН, 10. Агэнцтва «Рэйтэр» паведамляе:

«Макданальд выяжджае з Лёндана ў Шатляндыю, дзе будзе да 25 чэрвеня, калі мяркуецца адкрыцьце парляманцкае сэсіі. Макданальд мае намер на кароткі тэрмін наведаць Жэнэву у верасьні гэтага году, калі мае адбыцца чарговы агульны сход Лігі Нацый. Паведамляецца такксама, што прэм'ер мяркуе паехаць у ПАЗШ, лічачы, што асабісты кантакт з прэзыдэнтам Гувэрам можа найбольш хутка дапамагаць палепшаньню адносін паміж Англіяй і Амэрыкай.

БЭН-ТЭРНЭР—КАНДЫДАТ У МІНІСТРЫ ПА СПРАВАХ ВУГАЛЬНАЕ ПРАМЫСЛОВАСЬЦІ

ЛЁНДАН, 10. Макданальд,—як паведамляе друк,—мяркуе даручыць пост міністра па справах вугальнае прамысловасьці старшыні саюзу тэкстыльшчыкаў—члену генэральнае рады кангрэсу трэд-юнёньну Бэн-Тэрнэру.

ТОМАС НАЛАДЖВАЕ «КАНТАКТ» З ПРАМЫСЛОЎЦАМІ

ЛЁНДАН, 10. У якасьці першай меры на сваім новым пасту міністра па барацьбе з беспрацоўем, Томас на гэтым тыдні склікае нараду з дырэктарамі чыгуначных таварыстваў. Пасьля гэтага Томас будзе мець нараду з прадстаўнікамі прадпрыемцаў іншых галін прамысловасьці, прычым зробіць рад прапаноў адносна рэканструкцыі прамысловасьці.

Карэспандэнт ТАСС'у паведамляе, што некаторыя члены габінэту імкнуцца паладзіць такім чынам супрацоўніцтва з выдатнейшымі дзеячамі прамысловасьці, каб гэтым самым паскорыць рацыяналізацыю прамысловасьці пад намінальным кантролем дзяржавы.

КАНСЭРВАТЫЎНЫ ДРУК НЕ ЗДАВОЛЕН БАЛЬДВІНАМ

ЛЁНДАН, 10. Некаторыя кансэрватыўныя газэты вядуць кампанію супроць Бальдвіна, патрабуючы зьмяшчэньня яго з пасту лідэра кансэватыўнае партыі. Газэты вінавацяць Бальдвіна ў тым, што ён прывёў сваіх прыхільнікаў да катастрофы. «Дэйлі Мэйль» у перадавіцы прапануе перадаць пост лідэра кансэрватыўнае партыі лёрду Бівэрбруку, уласьніку вядомага газэтнага трэсту («Дэйлі Экспрэс» і іншыя газэты»). «Дэйлі Мэйль» заяўляе, што калі Бальдвін застанецца на пасту кансэрватыўнага лідэра, дык гэта загубіць кансэрватыўную партыю.

Амэрыканская паліцыя страляла ў жанчын і дзяцей забастоўшчыкаў

ФАБРЫКАНТЫ ТЭРАРАМ ІМКНУЦЦА СПЫНІЦЬ ЗАБАСТОЎКУ ТЭКСТЫЛЬШЧЫКАЎ

НЬЮ-ЁРК, 10. Камуністычная газэта «Дэйлі Уоркер» паведамляе падрабязнасьці крывавае сутычкі ў Гастоніі, дзе паліцыя разагнала мітынг бастуючых тэкстыльшчыкаў і разграміла лягеры гарадок рабочых.

Паліцыя прабавала разброіць рабочую самаабарону, адкрыла агонь па палатках, у якіх знаходзіліся жанчыны і дзеці. Начальнік паліцыі быў забіты, трое паліцэйскіх і старшыня левага саюзу тэкстыльшчыкаў у Пасайку паранены.

Арыштаваны Фрэд Біль—дзеяч левага саюзу тэкстыльшчыкаў, якога паліцыя лічыць арганізатарам забастоўкі ў Гастоніі. Фабрыканты пагражаюць пакончыць з Білем самасудам. Біль накіраван у турму, але ў якую—невядома. Арыштавана 65 удзельнікаў забастоўкі. Паводле чутак, паліцыя прад'явіць 20 арыштаваным абвінавачаньне ў забойстве.

Амэрыканская сэкцыя МОПР'у узяла арыштаваных пад сваю абарону.

Рэпрэсіі супроць камуністых ва Францыі

ПАРЫЖ, 10. Былы камуністычны дэпутат Карнавэн, асуджаны да грашовага штрафу за заклік салдат да непаслухмянасьці, прысуджаны зараз да турэмнага зьняволеньня за нявыплату штрафу.

***

ПАРЫЖ, 10. У Ашэры разам з трымя іншымі камуністымі арыштаваны член ЦК францускае кампартыі Торэз, які на працягу двух год хаваўся пасьля таго, як быў прысуджан да 8 месяцаў турмы і вёў партыйную работу падпольна.

Капіталістычная рацыяналізацыя ва Францыі

ПАРЫЖ, 10. Кангрэс унітарнае фэдэрацыі чыгуначнікаў закрыўся ў суботу. На апошнім пасяджэньні Манмусо, Сэмар і Мідоль выступілі з падрабязнай характарыстыкай капіталістычнай «рацыяналізацыі». Як падкрэсьлівалі прамоўцы, гэта «рацыяналізацыя», якую абараняюць рэфармістыя, у надзвычайнай мэры ўзмацняе эксплёатацыю рабочых і цягне за сабою новы рост ваеннае небясьпекі.

На пытаньні аб ваеннай небясьпецы падрабязна спыніўся Крап'е у дакладзе аб становішчы ў Алжыры. Прамоўцы заклікалі чыгуначнікаў прыняць чынны ўдзел у падрыхтоўцы міжнароднага антыімпэрыялістычнага дня 1-га жніўня.

Кангрэс пастанавіў выдаць прамовы Манмусо, Сэмара, Мідоля і Крап'е асобнай брашурай. Рэзалюцыі па пытаньні аб капіталістычнай «рацыяналізацыі» і аб ваеннай небясьпецы, якія падкрэсьліваюць асноўныя палажэньні, высунутыя ў гэтых прамовах, прыняты кангрэсам большасьцю ўсіх галасоў супроць аднаго.

Забастоўка тэкстыльшчыкаў Бамбэю ня спыняецца

ЛІК БАСТУЮЧЫХ ДАСЯГАЕ 110.000 ЧАЛАВЕК

ЛЁНДАН, 10. Забастоўка бамбейскіх тэкстыльшчыкаў праходзіць з вялікай аднадушнасьцю. Лік бастуючых тэкстыльшчыкаў у Бамбеі даходзіць да 110 тыс. чалавек. Чырвоны саюз тэкстыльшчыкаў «Гірні Камгар» рашуча адхіляе прапанову прадпрыемцаў аб пасярэдніцтве іншых нацыяналісцкіх лідэраў.

Бастуючыя патрабуюць аднаўленьня на рабоце 6.000 рабочых, звольненых пасьля папярэдняе забастоўкі. Англійскі камуністы Гетчынсон, які жыве ў Бамбеі, абраны намесьнікам старшыні «Гірні Камгар».

Якасьць савецкіх прадуктаў задавальняе ангельскі рынак

МАСКВА, 10. 10-га чэрвеня ў Маскву прыехала ангельская каапэрацыйная дэлегацыя, якую сустракалі прадстаўнікі каапэрацыйных арганізацый. Дэлегацыя паведміла супрацаўнікаў ТАСС наступнае:

«Мы імкнемся да разьвіцьця гандлю паміж ангельскай і савецкай каапэрацыяй. **Савецкія прадукты, як масла, яйкі і інш. па сваёй якасьці і ўпакоўцы цяпер зусім здавальняюць ангельскі рынак. Тое, што мы бачылі ў Ленінградзе, здаволіла нас і мы спадзяемся ўбачыць у Маскве, а таксама на Урале і ў Сібіры яшчэ больш».**

На пытаньне аб пэрспэктывах англа-савецкіх адносін у сувязі з перамогаю рабоча партыі, дэлегацыя адказала, што яна спадзяецца, што рабочы ўрад адновіць дыплёматычныя адносіны з Савецкім Саюзам і што будуць зроблены крокі да ўзмацненьня гандлёвых адносін.

10-га чэрвеня ангельская дэлегацыя наведала Маслацэнтр і Цэнтрасаюз, дзе прадстаўнікі дэлегацыі мелі гутарку з старшынёю праўленьня Любімавым і загадчыкам кіраўніцтва замежнага гандлю Цэнтрасаюзу Рабіновічам 12-га чэрвеня дэлегацыя выяжджае ў Сібір.

БЯСКОНЦЫ ПАЛЁТ НА АЭРАПЛЯНЕ

Досьледы прафэсара Рынін

ЛЕНІНГРАД, 11. У лябараторыі паветранага факультэту Ленінградзкага інстытуту шляхоў зносін прафэсар Рынін пачаў практычныя работы па ажыцьцяўленьня ў авіяцыі прынцыпу бясконцага палёту, г. зн. палёту без запасаў гаручага. У гутарцы з супрацоўнікам Роста, прафэсар Рынін сказаў:

«Калі аэраплану ўдасца дасягнуць вышыні некалькіх тысяч кілёмэтраў, дык ён пападае ў атмасферу, у якой можа быць помесь пэўнае прапорцыі тлену і вадароду. Помесь гэта стварае грымучы газ, які можа замяніць пару бэнзыны. Калі на аэраплане паставіць турба-кампрэсар, дык апошні, пачаўшы сваю работу з невялікага запасу гаручага ўзятага на зямлі, будзе зьбіраць звонку разрэжаную помесь тлену з вадародам і сьціскаць яе да патрэбнае шчыльнасьці, падрыхтоўваючы, такім чынам, неабходны для матораў апал (гаручае). Матор-жа ў далейшым будзе прыводзіць у рух і самы турба-кампрэсар. Такім чынам, аэрапляны падняўшыся на вялікую вышыню ва ўмовах памянёнага складу атмасферы, можа ляцець неакрэсьлены час, не патрабуючы запасаў гаручага. Для дасягненьня такой вышыні, зразумела, неабходна стварыць адпаведныя сродкі і прылады, (напрыклад, катапульт, рэактыўныя апараты, ракеты і г. д.). У гэтым і заключаецца магчымасьць ажыцьцяўленьня бясконцага палёту. Паколькі вялікая вышыня будзе дасягнута, пастолькі аэраплян будзе мець магчымасьць некалькі раз абляцець вакол зямное кулі, ня зьніжаючыся ў больш шчыльныя пласты атмасферы і разьвіваючы хуткасьць у некалькі тысяч кілёмэтраў у гадзіну. Бліжэйшыя работы лябараторы павінны даць досьыць канкрэтныя вынікі для таго, каб гэта ідэя атрымала поўнае ажыцьцяўленьня. Над прынцыпам бясконцага палёту зараз праводзяцца работы ня толькі ў нас, але таксама ў ПАЗШ і Нямеччыне.

Зьезд „таварыства беларускае школы“ у Вільні

Нячуваныя рэпрэсіі супроць беларускага нацыянальна-вызваленчага руху

БОЛЬШАЯ ЧАСТКА ДЭЛЕГАТАЎ АРЫШТАВАНА. ДЭФЭНЗЫВА РЫХТУЕ ПРАЦЭС СЯБРОЎ „ТБШ“

Беларускія нацыянал-фашыстыя ў цесным саюзе з дефэнзывай

19-га мая ў Вільні, ня гледзячы на нячуваныя рэпрэсіі, адбыўся заходнебеларускі зьезд Таварыства Беларускае школы (ТБШ). Легальныя магчымасьці для падрыхтоўкі і правядзеньня гэтага зьезду былі зьведзены на нішто. Паліцэйскія ўлады закрылі 6 акруговых упраў ТБШ—Глыбоцкую, Вілейскую, Навагрудзкую, Слонімскую, Баранавіцкую і Радашковіцкую. Касоўская ўправа страціла свой актыў, які арыштаваны ўладамі. У Слонімшчыне з 54 гурткоў ТБШ засталося незакрытымі толькі 10. У Глыботчыне незакрытымі засталося толькі 3 гурткі. Больш або менш «нармальна» працавалі Беластокская, Гродзенская і Столпецкая ўправы. Але і іх работа праходзіла і праходзіць у абстаноўцы ўзмоцненага тэрору і прасьледваньняў з боку ўлад.

Перад агульным зьездам ТБШ адбыўся толькі адзін зьезд Столпецкай акруговай управы ў мястэчку Міры, дзе была абрана новая акруговая ўправа, дэлегаты на зьезд і прынята рэзалюцыя, якая асуджае работу беларускіх нацыянал-фашыстых.

У выніку падрыхтоўкі зьезду, у Вільню выехала каля 180 дэлегатаў ад усіх упраў і найбольш актыўных гурткоў ТБШ. У дзень зьезду і напярэдадні яго пачалася «кампанія» з боку паліцыі адміністрацыі.

Паведамленьне аб забароне зьезду, аб няпрызнаньні галоўнай управы з боку Віленскага староства, узмоцненыя паліцэйскія пасты ў цэнтры гораду, цэлыя банды шпікоў і паліцэйскіх перад сакратарыятам соймавага беларускага рабочасялянска клюбу і домам, дзе павінен быў адбывацца зьезд, узмоцнены нагляд на вакзале,—усё гэта сьведчыла аб тым, што паліцыя і ўлады наогул вырашылі зьезд сарваць ва што-б там ні стала. У цягніках шпікі і паліцэйскія арыштоўвалі ўсіх «падазронных пасажыраў», праводзячы праверку дакумантаў, багажу і асабістыя вобыскі. Усе «падазронныя» пасажыры ў гэтыя дні прасядзелі ў паліцэйскіх пастарунках і «бясплатна» вярнуліся дамоў.

У Вільню трапілі толькі тыя, якія здолелі ўскокваць і высковаць з цягнікоў на хаду, ісьці цэлыя дзесяткі кілёмэтраў ад станцыі да станцыі пехатою (частка Беластоцкае дэлегацыі), прабіцца праз патройную лінію пастоў на вакзале, у горадзе і пры сакратарыяце клюбу.

Такіх аказалася 28 чалавек. У Віленскім цэнтральным арышце сядзела 40 чалавек. Ня гледзячы на ўсё гэта, зьезд ўсё-такі быў адкрыты і прашоў з вялікім уздымам.

На зьезьдзе ўхвалены дзьве рэзалюцыі: адна—па дакладах з месц і адна агульна-палітычная—пратэст супроць фашысцкага тэрору. Абрана галоўная ўправа і рэвізійная камісія.

На 19 мая меркавалі склікаць «зьезд» і беларускія нацыянал-фашыстыя Луцкевіч і К-о. Але зьезд яны адпажылі на ліпень месяц. Гэта пастанова выклікана поўным правалам падрыхтоўчых работ нацыянал-фашыстых да свайго «зьезду». Паводле вестак, падрыхтоўка да ліпеньскага «зьезду» нацыянал-фашыстых будзе ісьці побач з узмоцненым тэрорам улад супроць усяго нацыянал-вызваленчага руху і яго арганізацыі. Рыхтуецца вялікі працэс ТБШ, на якім, як зэўсёды, будуць фігураваць правакацыйныя дакуманты, напісаныя дэфэнзывай або яе памоцнікамі—беларусамі нацыянал-фашыстымі.

Зьезд ТБШ заклікаў працоўныя масы да байкоту нацыянал-фашысцкага зьезду і рашучай барацьбе з белрускай фашысцкай «двойкой» Трэпкі і Шнаркевіча, якая кіруе падрыхтоўкаю гэтага зьезду.

Мінуўшы зьезд ТБШ паказаў, што нацыянальна-вызваленчы рух беларускіх працоўных мас, ня гледзячы на тэрор фашысцкіх акупантаў, мацнее, расьце і разьвіваецца.

РАЗГУЛ ПОЛЬСКІХ ПАГРОМШЧЫКАЎ НЯ СПЫНЯЕЦЦА

ЯЎРЭЙСКІ ПАГРОМ У ПАЗНАНІ

ВАРШАВА, 10. Антысэміцкія выступленьні з Львова перакінуліся ў Пазнань. У суботу ў Пазнані антысэміцкая дэманстрацыя студэнтаў накіравалася ў яўрэйскі раён гораду, зьбіваючы па дарозе сустрэчных яўрэяў і б'ючы шыбы ў яўрэйскіх магазынах і ўстановах. Дэманстрацыя прыняла настолькі шырокія разьмеры, што паліцыя прымушана была выступіць супроць студэнтаў і разагнаць дэманстрацыю.

У кіруючых колах шавіністычнага студэнцтва ідзе дзейная падрыхтоўка да правакаваньня анты-яўрэйскіх выступленьняў студэнцтва ў Вільні і Любліне. У Варшаве адбыўся мітынг шавіністычнага студэнцтва, на якім вынесена рэзалюцыя з патрабаваньнем вызваленьня студэнтаў-пагромшчыкаў, арыштаваных у Львове. Студэнты патрабуюць увядзеньня процантнае нормы для яўрэяў пры прыёме ў вышэйшыя навучальныя ўстановы.

ЗА СЬПІНОЮ ЛЬВОЎСКІХ ПАГРОМШЧЫКАЎ

КІЕЎ. У Кіеў прыехаў з Вены аўстрыйскі грамадзкі дзеяч, член таварыства прыяцеляў СССР—Ото Шарк. З поваду апошніх падзей у Львове, Ото Шарк заявіў наступнае:

«Яўрэйскі пагром у Львове зрабіў вялікае ўражаньне ў Аўстрыі. Грамадзкасьць глыбока ўсхвалёвана тымі выступленьнямі, якія ўчынілі польскія студэнты-фашысты з благаславеньня польскіх улад у Львове. Мае першыя ўражаньні ад наведаньня Львову былі такія: я апынуўся ў атмасферы жахлівага чалавеканенавісьніцтва і поўнага адсутчаньня. Я прышоў да пераконаньня, што падзеі ў Львове будуць паўтарацца да таго часу, пакуль за сьпінамі пагромшчыкаў будуць хавацца сапраўдныя віноўнікі крывавых падзей».

ПРАФЭСАРЫ-ПАГРОМШЧЫКІ

ВАРШАВА, 9. «Роботнік» паведамляе, што ў дэманстрацыі, наладжанай у Пазнані польскім нацыяналістычным студэнцтвам 8-га чэрвеня прымалі ўдзел прафэсары Пазнанскага унівэрсытэту. Дэманстрацыя з унівэрсытэту накіравалася на стары рынак, прычым, па дарозе граміліся ўсе яўрэйскія крамы і сынагогі. Усяго зьбіта некалькі сот яўрэяў. Паліцыя трымалася пасыўна і не перашкаджала пагромшчыкам.

Падбіраньне ахвяр пагрому карэтамі хуткае дапамогі цягнулася да 10 гадз. увечары.

Культурнае зблiжэньне Латвіі з СССР

Нядаўна адбылося ўрачыстае адчыненьне таварыства культурнага зблiжэньня латвіі з СССР.- Гэта і ўрачыстасьць прайшла з вялікім уздымам. Заля нацыянальнага тэатру дзе ўсе гэта адбывалася, была перапоўнена. Білеты былі распраданы за некалькі дзён наперад. Урачыстасьць адкрыў старшыня таварыства вядомы паэта Райніс. У сваёй прывітальнай прамове ён заявіў: «У Латвіі існуе рад таварыстваў культурнага зблiжэньня з нашымі блізкімі і далёкімі суседзямі. У гэтым ланцугу прыяцельскіх адносін не хапала аднаго зьвяна—сувязі з усходам, дзе жыве шмат народаў з асобнай нацыянальнай культурай, адмежаванца ад якіх было-б няправільна. Мы цэнім Захад, але мы вырасьлі пад уплывам Усходу и пераняли ад яго шмат станоўчага, асабліва ў галіне навукі і мастацтва.

У гістарычным лёсе блiжэй да нас сталі беларускі і вялікарускі народы. З першым мы разам знаходзіліся пад уладай Вялікай Літвы, з другім—пад уладаю цара, калі існавала выключна культурнае прыгнечаньне, а ня вольнае ўспрыяцьце культурных дасягненьняў, якія мы зараз можам вольна ўспрыняць ці адкінуць. Замыкаючы ланцуг сяброўства новым зьвяном, абернутым на Ўсход, наша інтэлігэнцыя са спазьненьнем пойдзе тым шляхам, на які ўжо даўно ўступілі дзеячы культуры ў Заходняй Эўропе. Усякае культурнае зблiжэньне—новая гарантыя міру. Будземжа працаваць над умацаваньнем ідэі міру».

Сьледам за Райнісам выступіў паэта Яун Судрабіш, які прачытаў верш спэцыяльна прысьвечаны гэтаму дню. Пасьля ўрачыстай часткі адбыўся канцэрт, у якім прымалі ўдзел лепшыя артыстычныя сілы Латвіі. Доўгімі аплёдысмэнтамі, якія пераходзілі ў авацыю. былі спатканы савецкія артыстыя: Качалаў, Барсава, Алексеєў і Ільлюшэнка.

На ўрачыстасьці прысутнічалі: старшыня сойму Калніньш, прэм'ер—Цэльмінш, міністр замежных спраў Балодзіс, паўнамочны прадстаўнік СССР т. Ларэнц і інш. Пасьля ўрачыстасьці ў савецкім прадстаўніцтве адбыўся прыём, які прайшоў вельмі ажыўлена.

Друк праяўляе вяліку цікавасьць савецка-латвійскага таварыства культурнай сувязі. Газэта «Пэдэя Брыдзі» апублікавала інтэрв'ю з сакратаром таварыства—вядомым літаратарам Грэвіньшам. які заявіў:

— Таварыства было створана каля месяца назад. Яно аб'ядае вядомых латвійскіх пісьменьнікаў і мастакоў. У ліку членаў таварыства пісьменьнікі—Павел Розітс, Адольф Эрс, Яун Сутрабіньш і інш. Мэта таварыства—папярыць тыя культурныя сувязі, якія ўжо існуюць паміж Латвіяй і СССР. Таварыства мяркуе арганізаваць абмен мастакамі паміж Латвіяй і СССР. Адначасова яно будзе дапамагаць арганізацыі экскурсій у гэтыя краіны, а таксама ўжыве захады ў справе выданьня твораў выдатных латвійскіх пісьменьнікаў на расійскай мове.

У гэтай атмасфэры сплачваньня справе зблiжэньня з Савецкім Саюзам адзінока прагучаў голас фашысцкага друку, які не прапусьціў выпадку эрабіць паклёпы на СССР.

А. ЛАПІНАС.

НАЛЕТ ПАЛІЦЫІ НА ЦК МЭКСЫКАНСКАЕ КАМПАРТЫІ

НЬЮ-ЁРК, 10. Паводле чутак, паліцыя зрабіла налёт на цэнтральны камітэт кампартыі , закрыла яго і забаранила выдаваць цэнтральны орган партыі.

На Савецкім Саюзе

Паказальны суд над бюракратамі

Рад злосных бюракратаў зьняты з работы

НОВАСІБІРСК, 11. У Чэрамхаве ў перапоўненым рабочым клюбе адбыўся паказальны суд над бюракратамі. Дырэктар галоўных мэханічных майстэрань Цюленэў, старшыня заўкому мэталістых Кірсанаў і старшыня вытворчай камісіі Казіцкі атрымалі грамадзкую вымову за бяздушныя адносіны да выпаходцы Мікалайчыка.

Грамадзкая в[illegible] вынесена памочнікіку загадчыка электрычнае станцыі Калініну, па віне якога парваўся канат у капальні № 2.

Зьнят з работы загадчык графітным складам Краваткін, які адмовіўся прыняць графіт у сялян, што прыехалі за некалькі дзесяткаў кілёмэтраў. Зьнята з работы білетная касірша станцыі Чэрамхава—Багонева за грубае абыходжаньне з пасажырамі.

Якія трактары нам патрэбны

МАСКВА, 11. На пасяджаньні Савету Працы і Абароны прадстаўнік Зернатрэсту выступіў з дакладам аб выніках працы вусьнічных трактараў у саўгасах і калгасах. Параўнаўчыя даныя аб працы трактару на колах і вусьнічнага, гавораць на карысьць апошняга. У саўгасах Зернатрэсту, як правіла, на палосах, па якіх прайшлі колы трактары, нагляда ася паніжэньне ўраджайнасьці ў вельмі шырокіх разьмерах; часамі яно даходзіць да 50-60 проц. Пры ўжываньні-ж вусьнічных трактараў, наглядаецца, наадварот, прырост ураджаю, з прычыны больш раньняга пачатку налівых работ гэтымі трактарамі і менш шкоднага іх уплыву на глебу. Зернатрэст лічыць патрэбным узмацніць будаўніцтва ў СССР вусьнічных трактараў.

Савет Працы і Абароны запрапанаваў Зернатрэсту і ўрадам саюзных рэспублік зрабіць спробу розных марак вусьнічных трактараў і абавязаў ВСН

Пленум Менскага АК КП(б)Б

Чатыры дні працаваў пленум Менскага АК КП(б)Б. Пленум абмеркаваў ад важнейшых пытаньняў па калектывізацыі, нацыянальнай рабоце, прамысловым будаўніцтве, рэгуляваньні сацыяльнага складу арганізацыі і г. д.

УЗМАЦНІЦЬ ВЯРБОЎКУ ПЕРАДАВЫХ РАБОЧЫХ

Па дакладу тав. **Тамашэўскага** аб росьце арганізацыі за лік рабочых, батракоў і с.-г. рабочых і рэгуляваньні сацыяльнага складу пленум адзначыў:

— Паляпшэньне сацыяльнага складу арганізацыі — рабочае ядро павялічылася на 6,2 проц.

Разам з гэтым пленум адзначыў, што ацільны тэмп росту арганізацыі за лік рабочых, батракоў і с.-г. рабочых яшчэ невыстарчальны.

Ва ўхваленай рэзалюцыі намечаны канкрэтныя мерапрыемствы па ўзмацненьні вярбоўкі ў партыю рабочых, батракоў і с.-г. рабочых.

— Па ўсіх калгасах і саўгасах будуць арганізаваны парт'ячэйкі і кандыдацкія групы. На летні час у саўгасы і калгасы будуць накіраваны камуністыя і камсамольцы для правядзеньня партыйнай работы.

Бюро акруговага камітэту заслухае даклады аб росьце і рэгуляваньні сацыяльнага складу **Фрунзаўскай, Кастрычніцкай, Самахвалавіцкай і Капыльскай арганізацый КП(б)Б.**

На працягу летняга часу бюро заслухае даклады аб росьце парт'ячэек фабрыкі **«Чырвоная Бярэзіна»** і заводаў **«Бальшавік»**, імя **Домбаля, «Дрэваапрацоўшчык».**

ПЫТАНЬНІ КАЛЕКТЫВІЗАЦЫІ СЕЛ. ГАСПАДАРКІ

Пленум удзяліў вялікую ўвагу пытаньням калектывізацыі. Сёлета ў часе веснавой пасеўнай кампаніі па акрузе арганізаваны **53 калгасы на плошчы 4.911 гэктараў.**

Гэта складае толькі 2 проц. зямель сельска-гаспадарчага карыстаньня.

Пленум падкрэсьліў, што такі процант зусім не адпавядае намечанаму тэмпу калектывізацыі сельскай гаспадаркі. **Выходзячы з гэтага, пленум прыняў рад пастаноў па ўзмацненьні калгаснага будаўніцтва ў акрузе.** Калгасаюзу, акрэа і фракцыям РВК даручана прыняць усе захады да разгортваньня ў акрузе **масавай работы па калектывізацыі сельскай гаспадаркі.**

У кожным раёне і сельсавеце будуць вызначаны найбольш адпаведныя вёскі і насёлкі для пераводу іх на калектыўныя формы зямлякарыстаньня.

Усе пытаньні калектывізацыі, матар'яльнага і вытворчага становішча калгасаў і г. д. знайшлі выразнае адлюстраваньне ў пастановах пленуму.

Трэба спыніць бясплянавае забесьпячэньне калгасаў насеньнем, машынамі і крэдытамі. Пленум абавязаў калгасаюз і крэдытсаюз сваячасова і сыстэматычна праводзіць гэтую работу. Разам з гэтым павінен быць арганізаваны плянавы збыт прадукцыі калгасаў. АПА АК КП(б)Б даручана забясьпечыць калгасы належнай колькасьцю масавай і агранамічнай літаратуры.

Падрыхтоўка кіруючага складу калгасаў будзе праводзіцца праз спэцыяльныя сельска-гаспадарчыя курсы.

Уся работа па калектывізацыі павінна праходзіць пад знакам сацыялістычнага спаборніцтва. Пастановы пленуму ў гэтым напрамку простыя і ясныя:

— Усе калгасы павінны ўступіць паміж сабою ў сацыялістычнае спаборніцтва за ўздым ураджаю, за выкананьне аграмінімуму, за лепшую апрацоўку глебы.

Уся сыстэма с.-г. кааперацыі і вытворчыя аб'яднаньні павінны быць максымальна скарыстаны для садзейнічаньня калгаснаму будаўніцтву. Пленум пастанавіў паляпшыць работу вытворчых аб'яднаньняў беднаты і серадняцкай (арцелі, камуны) для пераводу іх на вышэйшыя формы калектывізацыі.

Бюро АК у бліжэйшы час вывучыць пытаньне аб вылучэньні аднаго раёну ў акрузе для паказальнага разгортваньня масавай калектывізацыі і арганізацыі трактарных калён.

Пленум адзначыў, што ажыцьцяўленьне гэтага мерапрыемства ні ў якім разе не павінна адбіцца на разгортваньні калгаснага будаўніцтва ва ўсёй акрузе.

ПЫТАНЬНІ НААЦРАБОТЫ

Даклад акруговай **нацкамісіі** (дакладчык тав. **Аксючыц**) выклікаў ажыўленыя спрэчкі. У абгаварэньні дакладу прымалі ўдзел амаль усе члены пленуму.

Пленум прызнаў работу акруговай нацкамісіі **здавальняючай і палітычную лінію правільнай.**

У выніку работы нацкамісіі мы маем поўныя посьпехі на фронце беларусізацыі і арганізацыйнага гаспадарча-культурнага абслугоўваньня нацменшасьцей. Для замацаваньня дасягнутых посьпехаў і зьнішчэньня існуючых недахопаў (усё яшчэ невыстарчальнае правядзеньне беларусізацыі, невыстарчальнае разгортваньне работы ў нацсаветах і г. д.) пленум ухваліў некалькі канкрэтных пастаноў і практычных прапаноў.

Галоўныя з іх:

Работу па беларусізацыі перавесьці па рэйкі сапраўднага глыбокага прасоўваньня ў масы беларускай пралетарскай культуры.

Нельга абмяжоўвацца фармальным агітацыйна-арганізацыйным падыходам да справы беларусізацыі.

Беларуская мова, беларуская пралетарская культура павінна быць прасунута ў працоўныя масы.

Пленум таксама прыняў рад важнейшых пастаноў па ўзмацненьні развіцьця польскай і яўрэйскай культур, па пытаньнях інтэрнацыянальнай работы, зямляўпарадкаваньня мястэчка, работы нацсаветаў і г. д.

***

Па дакладу тав. Дамброўскага аб чыстцы партарганізацыі пленум ухваліў дырэктывы АК і АКК **аб узмацненьні падрыхтоўчай работы да чысткі арганізацыі.**

Побач з іншымі практычнымі пастановамі пленум абавязаў РК і ячэйкі вызваліць усіх членаў праверкомаў ад партыйнай і грамадзкай нагрузкі.

***

Значнае месца ў рабоце пленуму займала абгаварэньне дакладу тав. **Карпа** аб становішчы прамысловасьці ў акрузе. Усе пастановы пленуму па гэтым пытаньні накіраваны на больш шпаркі тэмп разьвіцьця прамысловага будаўніцтва ў акрузе і шырокае разгортваньне сацыялістычнага спаборніцтва паміж заводамі і фабрыкамі.

***

10 чэрвеня ўвечары пленум закрыўся.

Працоўныя БССР--ахвярам сацыял-фашызму

Кампанія дапамогі ахвярам сацыял-фашызму працягваецца да 15-га ліпеня

Не павінна быць ніводнай ячэйкі МОПР'у, якая-б ня прынесла сваю частку ў агульную справу дапамогі

Весткі аб тым, што сацыял дэмакратычная паліцыя на вуліцах Бэрліну ў дні 1-га мая пралла рабочую кроў, знайшлі жывы водгук у сэрцах працоўных мас Савецкае Беларусі. На першыя паведамленьні прэсы аб першамайскіх падзеях у «дэмакратычнай» Нямеччыне, працоўныя масы БССР адказалі шырокай хваляй пратэсту супроць шалёнага тэрору нямецкіх катаў. Арганізацыі Мопру пачалі зьбіраць сродкі на дапамогу ахвярам сацыял-фашызму.

Якія-ж першыя вынікі гэтай кампаніі?

У кампаніі актыўна ўдзельнічалі чырвонаармейскія, мопраўскія арганізацыі, служачыя і часткова наша савецкая інтэлігенцыя, асабліва асьветнікі.

На 10 чэрвеня ЦК МОПР'у БССР атрымаў грашыма (разам з паведамленьнямі аб высылцы грошай) усяго звыш 20.000 руб., прычым па Менскай акрузе сабрана 10.000 рублёў, па Гомельскай, Віцебскай і Бабруйскай звыш 3.000 р. у кожнай, па Мазырскай — каля 1.000, па Магілеўскай — 500 руб. Па Полацкай і Артанскай акругах кампанія разгортваецца, але-ж матар'яльных сродкаў пакуль што не атрымана.

Трэба адзначыць найбольш вялікія сумы, якія сабраны паасобнымі ячэйкамі Мопру: ячэйка Мопру зав. «Чырвоны Металіст» (Віцебск) — 1.000 р., панчошнай фабрыкі (Віцебск) — 450 р., парсувізі (Менск) — 350 р., «Эльвод» (Менск) — 345 р., Наркамзем (Менск) — 319 руб.

Фрунзаўскі райком Мопру (Менск) сабраў 3.200 рублёў ад 59 ячэек Мопру.

Горш абстаіць справа ў Кастрычніцкаўскім райкоме МОПР'у (Менск), дзе дагэтуль сабрана толькі усяго каля 1.000 рублёў.

Нічога ня чуваць, што робіць Барысаўскі гарком МОПР'у які працуе ў гэткім буйным пралетарскім цэнтры.

Слаба адгукнуліся вясковыя райкомы МОПР'у. Вядома толькі, што Бярэзінскі раён (Меншчына) даў 364 руб., Смалявіцкі раён — 266 руб., Самахвалавіцкі — 155 руб.; Нетрыкаўскі раён (Мазыршчына) — 219 руб., іншыя раёны далі значна меншыя сумы, ад многіх раёнаў зусім няма вестак.

Вывад зусім ясны. Некаторыя мопраўскія арганізацыі як у гаралох, гэтак і на вёсцы, як відаць, не адчуваюць той вялікай адказнасьці за правядзеньне кампаніі дапамогі ахвярам сацыял-фашызму, якую яны нясуць перад міжнародным пралетарыятам. Гэта недапушчальна! Трэба разварушыць усе райкомы, усе ячэйкі МОПР'у як у горадзе, гэтак і на вёсцы. Час да 15 ліпеня трэба скарыстаць для пасьпяховага правядзеньня кампаніі.

М. Калмык.

Ганьба сацыял-дэмакратыі

Хваля пратэстаў супроць расправы сацыял-дэмакратыі з рэвалюцыйнымі рабочымі Бэрліну, супроць фашысцкага тэрору ў іншых краінах капіталу, ахапляе ўсё новыя і новыя пласты працоўных. Кожная арганізацыя, кожны калектыў сьпяшаецца далучыць свой голас да агульнага крыку пратэсту працоўных мас БССР.

— **Першы ўсебеларускі зьезд бязбожнікаў**, выказаўшы рэзкі пратэст супроць фашысцкага тэрору, адзначыў, што крывавая работа буржуазіі праводзіцца з благаславеньня царкоўнікаў усіх рэлігій. Зьезд заклікаў усіх бязбожнікаў да самага рашучага пратэсту супроць азьвярэлых фашыстых.

***

— **Зьезд працоўных палякаў актывістых** паслаў братэрскае прывітаньне барацьбітом за лепшую долю, якія пакутуюць у капіталістычных турмах, і заклікаў усіх працоўных палякаў пратэставаць супроць расправы капіталістычных катаў над рэвалюцыйнымі рабочымі і сялянамі.

Крывавая работа буржуазіі праводзіцца пры дапамозе сацыял-дэмакратыі, якія душаць рэвалюцыю ва ўсім сьвеце.

— Гарачы пратэст супроць расстрэлу бэрлінскіх рабочых ад імя 13.000 членаў МОПР'у выказала **Мазырская акруговая канфэрэнцыя МОПР'у.**

— Ніякія кулі, турмы і бізуны ня прымусяць рэвалюцыйных рабочых спыніць барацьбу за дыктатуру пралетарыяту,—гаворыцца ў рэзалюцыі канфэрэнцыі.

ПАРТЫЙНАЕ БУДАЎНІЦТВА

ПРАВЕРКА БАЛЬШАВІЦКІХ РАДОЎ

У ПРАВЕРАЧНЫХ КАМІСІЯХ ПА ЧЫСТЦЫ ПАРТЫЙНЫХ РАДОЎ МОГУЦЬ БЫЦЬ ТОЛЬКІ ВЫТРЫМАНЫЯ БАЛЬШАВІКІ

Адначасова з генэральнай праверкай і чысткай партыі—шырока разгарнуць вярбоўку ў партыю перадавых рабочых і батракоў

Лепшых бальшавікоў--у праверачныя камісіі

Другі агульна-лягерны партсход з шырокім удзелам беспартыйных чырвонаармейцаў і камандзіраў лягеру «Чырвонае ўрочышча» быў прысьвечаны праверцы таварышоў, вылучаных у праверкомы па чыстцы партыі.

У камісіі па праверцы таварышоў, якія вылучаны ў праверачныя камісіі, **т. Дамброўскі**—член УсеКП(б) з 1909 г., старшыня АКК т. **Самойлаў**, рабочы-мэталісты, член партыі з 1917 г., т. **Новікаў**, член УсеКП(б) з 1919 г., сакратар дывіз. парткамісіі.

Тав. Дамброўскі, адкрываючы сход, сказаў:

— Праверка таварышоў, што вылучаны ў праверачныя камісіі,—вялікая справа. Гэтыя таварышы па ўказаньнях партыі праходзяць праверку ў першую чаргу. Мы тут праверым, як ячэйкі падышлі да вылучэньня кандыдатур у камісіі па чыстцы партыі.

Першым праходзіць чыстку пам. паліт. начшколы АББШ т. **Арабей.**

Член УсеКП(б) в 1920 г., служачы, у Чырвонай арміі—з 1919 г., быў на палітычных пасадах, пачынаючы з паліткіраўніка да камісара дывізіі ўключна. За ім т. **Альфяровіч**, член УсеКП(б) з 1919 году, рабочы, добраахвотнік Чырвонай арміі з 1920 г., працаваў па барацьбе з бандытызмам.

Тав. Дамброўскі пытаецца:

— Ці можна пакінуць т. Альфяровіча ў камісіі па чыстцы?

— Можна,—адказвае сход.

Потым адзін за адным правяраюцца т. т. **Астроўскі, Губікаў, Ягіпцаў, Загароўскі, Ланцінаў, Мясьнікоў, Платонаў, Калабаеў і Міхайлоўскі.** Усе яны вытрыманыя бальшавікі і карыстаюцца ў масах вялікім аўтарытэтам.

Галоўная ўвага сходу была накіравана на выяўленьне пытаньняў сувязі з масамі, актыўнасьці ў партрабоце і іх клясавай вытрыманасьці.

На некаторых таварышох затрымліваліся да 40 хвілін і, калі былі якія-небудзь няясныя пытаньні, іх стараліся высьвяціць з усёй паўнатой.

Расказы кожнага з таварышоў, якія правяраюцца,—гэта кавалкі грамадзянскай вайны, гэта вялікія старонкі будаўніцтва палітычнага апарату ў арміі, пашырэньня, ляцьцяленьня палітычнага выхаваньня байца, далучэньня арміі да вялікага будаўніцтва і падрыхтоўкі надзейнай абароны краіны Саветаў.

Прысутныя вельмі актыўна, праз пытаньні, выступленьні дапамагалі камісіі ў справе адбору кандыдатаў у праверачныя камісіі.

С. К.

Рабочыя прымаюць удзел у праверцы

На адкрытым куставым партсходзе ў Камуністычным унівэрсытэце.

Сотні рабочых заводу «Камунар» 1 галянтарэйнай фабрыкі запоўнілі залю камвузу. Рабочыя, работніцы, камсамольцы, рабочая моладзь уважліва слухаюць уступнае слова тав. **Герасімава.** Ён коратка спыняецца на галоўных задачах і палітычным значэньні чысткі.

Першым правяраецца тав. **Баль.** Былы чэкіст, чырвонагвардзеец, удзельнік грамадзянскай вайны, у партыі з 1918 году. Працаваў на чыгунцы машыністым. Зараз член ЦК КП(б)Б. Намесьнік старшыні ВСНГБ. Тав. Баль у свой час быў сакратарам Полацкага АК КП(б)Б.

Задаецца пытаньне:

— Чым можна тлумачыць вядомы працэс полацкіх судзьдзяў, разлажэньне і хабарніцтва ў Полацкім судзе?

— Чаму вы як палітычны кіраўнік акругі не рэагавалі сваячасова на ўсе гэтыя факты?

Тав. Баль растлумачвае. Злачынствы ў Полацкім судзе тварыліся да таго часу, пакуль я стаў сакратаром АК. Прычыны паяўнасьці такіх фактаў ляжаць у тым, што Полацкая акруга выключна сялянская. Пралетарскае ядро зусім нязрыкметнае. Наймэнш стойкія нявытрыманыя партыйныя і савецкія працаўнікі падпадаюць пад уплыў дробна-буржуазнай ідэалёгіі мяшчанства і кулакоў. У выніку—сувязь з чужым элемэнтам, скажэньні клясавай лініі, хабарніцтва, п'янства.

Частку віны трэба бязумоўна аднесьці і на акругком. Партыйнае кіраўніцтва было пастаўлена слаба.

На трыбуне тав. **Затурэнскі**, сакратар партколектыву заводу «Камунар», сьлесар. Член бюро Менскага АК КП(б).Б

Камунараўцы ня маюць пытаньняў, каб задаць правяраемаму. Яны яго добра ведаюць, добра вывучылі ў штодзённай работе ля варштату. Затое камісію цікавіць цэлы рад пытаньняў.

Ці мелі партпагнаньні?

— Як парткалектыў змагаецца з праяўленьнямі правага ўхілу, з прымірэнцтвам?

— Ці ўступіў «Камунар» у сацыялістычнае спаборніцтва?

Тав. Затурэнскі на ўсе пытаньні дае падрабязныя адказы.

Асабіста ніякіх спагнаньняў ня меў. Бюро Фрунзаўскага РК КП(б)Б паставіла на від усяму бюро парткалектыву за несваячасовае рэагаваньне на выпадкі антысэмітызму на заводзе. Мы гэта ўлічылі, прызналі сваю памылку і выправілі.

— Хістаньні сярод асобных членаў калектыву ёсьць. Некаторыя партыйцы не разумеюць сутнасьці правага ўхілу і прымірэнцтва. Мы змагаемся з гэтымі зьявішчамі ўзмацненьнем палітыка-выхаваўчай работы.

Праверка праходзіць т. т. **Лубуж, Сянкевіч, Пятрушын, Цэнцыпэр і інш.**

Позна ўначы скончыўся сход. Сход прайшоў актыўна, пад знакам самакрытыкі.

Г. Т.

Дырэктыва па вярбоўцы ў партыю перадавых рабочых і батракоў выконваецца слаба

(Мазыр)

Лістападаўскія пленумы ЦК УсеКП(б) і ЦК КП(б)Б і XII зьезд КП(б)Б далі дырэктыву партыйным арганізацыям ад вярбоўцы ў рады партыі перадавых рабочых і батракоў. Як-жа пізавыя парт-арганізацыі ажыцьцяўляюць гэту дырэктыву? Наша Мазырская акруговая партарганізацыя за пэрыяд з студзеня па чэрвень месяц г. г. узрасла на 144 чалавекі, сярод іх: рабочых ад варштату—74, батракоў і с.-г. рабочых—19, калгасьнікаў—12 і рэшта сяляне і саматужнікі.

Калі прыгледзецца, як адбываўся гэты рост па асобных раёнах, дык убачым, што некаторыя райкомы КП(б)Б гэтаму пытаньню не аддалі належнай увагі. Так, **Калінкавіцкі райком**, паліч-ваючы на сваёй тэрыторыі значную колькасьць чыгуначнікаў і іншых груп рабочых, прыняў за гэты час у партыю 9 рабочых і аднаго батрака. Капаткевіцкі райком завербаваў у партыю толькі аднаго рабочага.

Дырэктыва аб тым, што ў агульным ліку асоб, якія прымаюцца вясковымі ячэйкамі ў партыю, павінны батракі і с.-г. рабочыя складаць 50 проц.—таксама ня выканана. Батракі і с.-г. рабочыя сярод асоб, што прымаюцца ў партыю, складаюць толькі 35,5 проц.

Лічбы аб росьце і асабліва аб партпраслойкі на асноўных прадпрыемствах (20 проц. да агульнага ліку рабочых) гаворыць аб тым, што ячэйкамі і РК далёка ня ўсё зроблена па лініі выкананьня дырэктыў партыі па вярбоўцы ў партыю рабочых і асабліва батракоў і с.-г. рабочых. Апошнія складаюць да агульнай колькасьці арганізацыі 4,7 проц.: у 9 саўгасах налічваецца 34 камуністыя, ці ў сярэднім па 2-3 камуністыя на саўгас. Арганізацыя ў апошнія часы дзьвёх парт'ячэек у саўгасы дасьць магчымасьць павялічыць рост арганізацыі за лік саўгасных рабочых. Зусім дрэнна з уцягненьнем батракоў у партыю, іх ва ўсёй арганізацыі налічваецца толькі 14 чалавек.

Ня выконваецца партарганізацыямі поўнасьцю дырэктыва і аб тым, каб справы па прыёме ў партыю праходзілі хутчэй: па раёнах афармленьне цягнецца ад аднаго да паўтара месяца, а ў гарадзкіх ячэйках—ад 3 тыдняў да аднаго месяца.

Б. Ш.

Усебеларуская канфэрэнцыя камсамолу

Усебеларуская канфэрэнцыя камсамолу, якая пазаўчора распачала сваю работу, на першым сваім пасяджэньні заслухала даклад тав. **Гантмана** аб выніках XVI усесаюзнай партканфэрэнцыі. Тав. **Гантман** у сваім паўтарагадзінным дакладзе, ахарактарызаваўшы той пэрыяд, у які адбывалася канфэрэнцыя, спыніўся на пытаньнях, якія вырашыла канфэрэнцыя і тых задачах камсамолу, якія вынікаюць з пастаноў канфэрэнцыі.

Гаворачы аб задачах камсамолу, якія паўстаюць перад ім у зьвязку з прыняцьцем 5-гадовага пляну сацыялістычнай рэканструкцыі народнае гаспадаркі, тав. Гантман сказаў:

— У галіне сацыялістычнага ўздыму нашай прамысловасьці канфэрэнцыя перад партыяй, камсамолам і ўсёй рабочай клясай краіны паставіла рад адказьнейшых, важнейшых задач. Па ўсёй савецкай краіне шырока разгортваецца сацыялістычнае спаборніцтва, **камсамол** праводзіць прамысловы паход. Аднак, калі мы прыгледзімся і ўважліва прасочым, якія практычныя вынікі ўжо даў прамысловы паход, дык убачым што камсамольская арганізацыя яшчэ ня ўсё зроблена для забесьпячэньня поўнай пасьпяховасьці ў гэтай справе. Калі некаторыя арганізацыі выявілі сваю ініцыятыву, узьнялі яе сярод рабочай моладзі, дык побач з гэтым мы маем ням-там у справе практычнай арганізацыі прамысловага паходу рад адмоўных зьявішч. Вось, напрыклад, у Віцебску на заводзе «Чырвоны Мэталіст» ў справе практычнай пастаноўкі прамысловага паходу камсамольцы крыху блыталіся. Яны ня зусім добра сабе ўяўлялі, што яны павінны ў гэтым напрамку рабіць заўтра, пасьлязаўтра...

Трэба больш сіл, больш энэргіі ўсле камсамольскае арганізацыі накіраваць на правядзеньне прамысловага паходу, на пагцібленьне масавае работы. Бо тыя труднасьці, якія паўстаюць у сувязі з ажыцьцяўленьнем 5-цігадовага пляну, патрабуюць, каб іх дэтальна растлумачылі шырокім гушчам рабочых і рабочай моладзі... Партыі ў гэтай справе павінен дапамагчы камсамол...

Спыняючыся на пытаньні сацыялістычнай рэканструкцыі сельскае гаспадаркі, дакладчык сказаў:

— Правыя апазыцыянэры імкнуцца даводзіць тое, што быццам наша сельская гаспадарка ідзе па шляху дэградацыі. Правая апазыцыя абвінавачвае партыю ў «фэадальнай эксплёатацыі сялянства» і высоўвае «тэорыю мірнага ўрастаньня кулака ў сацыялізм». З дакладу тав. Калініна на 16-й партканфэрэнцыі мы бачым, што наша сельская гаспадарка за апошнія гады набыла рад вялікі хопсьпехаў, зрабіла вялікія крокі наперад. Мы ня ўтойваем таго, што сельская гаспадарка ў тэмпе свайго разьвіцьця адстае ад прамысловасьці, мы выразна канстатуем тое, што ў нас у сельскай гаспадарцы яшчэ нізкая ўраджайнасьць, таварнасьць, вялікая раздробленасьць. Гэта ўсё бязумоўна адбіваецца на тэмпе яе разьвіцьця.

XVI партканфэрэнцыя рашуча паставіла пытаньне аб калектывізацыі сельскай гаспадаркі. Гэта пытаньне і перад партыяй і перад камсамолам ставіць рад вялікіх і складаных задач, на выкананьне якіх мы і павінны накіраваць нашу асноўную ўвагу. Калі мы прагледзім нашу практычную работу ў гэтым напрамку, дык убачым шмат адмоўнага. Яшчэ ня ўсе камуністы і камсамольцы ўзяліся за выкананьне партыйных дырэктыў па калектывізацыі, ня ўсе яшчэ агітуюць сялян паказам, сваім уласным прыкладам. Мы павінны рашуча паставіць пытаньне перад камуністымі і камсамольцамі аб нераходзе ў калектывы. Мы-ж ставім пытаньне перад камуністымі і камсамольцамі, што працуюць за варштатам, аб іх прыкладнасьці на вытворчасьці, аб тым, што яны павінны быць сапраўднымі перадавікамі ў сваім цэху, на заводзе. Чаму-ж мы ня можам паставіць пытаньня і перад камуністымі, і камсамольцамі сельскімі гаспадарамі аб тым, што яны павінны быць перадавікамі ў будаўніцтве новай сацыялістычнай вёскі. Праўда, мы ўжо маем рад прыкладаў, калі камсамольцы, ячэйкі ЛКСМБ сёе-тое зрабілі ў справе калектывізацыі. Аднак, масавага ўсьведамленьня задач па калектывізацыі, шырокага масавага ўдзелу ў гэтай справе мы яшчэ не маем. Камуністы і камсамолец вёскі павінны прабуджаць яшчэ шырэй ініцыятыву сялянства, каб яно ўступала ў калгасы, павінны агітаваць сялян уласным прыкладам, разьвіваць вытворчае каапэраваньне сярод бядняцкіх і серадняцкіх мас вёскі.

Другую частку свайго дакладу тав. Гантман прысьвяціў задачам барацьбы за генэральную лінію партыі супроць апартуністычнага правага ўхілу

Камсамол--верны праваднік Ленінскай лініі партыі

Ранішняе пасяджэньне ўчора пачалося з прывітаньня канфэрэнцыі прадстаўнікамі ад лінкора «Парыская Камуна» т. т. **Іофэ і Курыста** якіх пад гучныя воплескі делегаты выбіраюць у прэзыдыум канфэрэнцыі.

— Камсамол адыграў вялікую ролю ў стварэньні нашага чырвонага флёту—кажа ў сваім прывітаньні т. **Іофэ.** Мы маем зараз магутны флёт, які гэраічна стаіць на варце морскіх межаў нашай пралетарскай краіны. Камсамол і флёт—гэта агульная сяброўская сям'я.

Ад імя асабістага складу лінкора «Парыская Камуна» т. Іофэ падносіць сакратару ЦК ЛКСМБ т. **Галавачу** чырвонафлёцкую форму.

З дакладам ЦК УсеЛКСМ выступіў загадчык АПА ЦК УсеЛКСМ т. **Андрэеў.** Дакладчык гаворыць аб тых задачах, што сталі перад камсамолам з часу 8-га зьезду УсеЛКСМ. Асноўная ўвага арганізацыі—кажа т. Андрэеў—была накіравана на правядзеньне генэральнай лініі партыі ў штодзённай практычнай рабоце, на барацьбу з рознымі ўхіламі і прымірэнцтвам. Мы з усёй рашучасьцю змагаліся з рэшткамі троцкісцкай апазыцыі, бязьлітасна выкрываючы контр-рэвалюцыйнасьць «левых» апартуністых.

Зараз мы мабілізавалі камсамол і працоўную моладзь на барацьбу з правым яўна апартуністычным ухілам ад ленінскай лініі партыі. Усю нашу энэргію, усю нашу ініцыятыву мы аддаем справе абароны генэральнай лініі ЦК УсеКП(б) ад усякіх скажэньняў, адкуль яны-б не паходзілі.

Камсамол на справе давёў, што ён быў і будзе верным правадніком ленінскіх ідэй, цьвёрдай апорай партыі ў штодзённым сацыялістычным будаўніцтве.

Аднак, і ў нашай арганізацыі ёсьць людзі, што не разумеюць важнасьці барацьбы з ухіламі, якія запэўняюць, што ўхілы характэрны толькі для партыі, а ў камсамоле яны ня маюць месца.

Гэтыя таварышы або памыляюцца, або сьвядома замазваюць небясьпеку правага ўхілу ў камсамоле. Праверка і чыстка нашай арганізацыі яскрава паказала, што ў камсамоле маюць месца і хваравітыя зьявішчы.

У **Смаленскай арганізацыі камсамолу ў выніку праверкі і чысткі распушчана 28 ячэек,** якія не ажыцьцяўлялі ленінскай лініі партыі, не дапамагалі партыі ў штодзённай рабоце, а наадварот перашкаджалі правядзеньню партыйнай лініі. Выключна з Смаленскай камсамольскай арганізацыі 1.470 чалавек, 12 проц. усёй арганізацыі.

У Сярэдняй Азіі ў склад акругкому камсамолу і нават сакратароў акруткомаў пралез чужы, антысавецкі элемэнт.

У Астрахані камсамольская арганізацыя замазвала хваравітыя зьявішчы. Сакратар акруткому выступаў на абарону нэпманскіх, антысавецкіх элемэнтаў.

Гэтыя факты гаворыць аб тым, што мы павінны падвоіць, патроіць работу па выхаваньні камсамольцаў і беспартыйнай моладзі. Трэба навучыць камсамольца ўбачыць клясавага ворага, не абмяжоўвацца красамоўнымі рэзалюцыямі, а праводзіць штодзённа ў жыцьцё пастановы партыі.

Далей дакладчык адзначае, што палітвучоба ў камсамоле паставлена не на належную вышыню, што шмат камсамольцаў і нават арганізацый няправільна разумелі прынцыпы добраахвотнасьці палітвучобы, у зьвязку з чым у некаторых арганізацыях наглядаецца ігнараваньне палітасьветы як з боку актыву, так і з боку радавых камсамольцаў.

Культурны паход, прамысловы паход за ўраджай і калектывізацыю далі вялізныя станоўчыя вынікі, прыцягнулі да сябе ўвагу ня толькі шырокіх мас працоўнай моладзі, але імі зацікавіліся дарослыя рабочыя. Аднак, у некаторых арганізацыях да гэтых паходаў аднесьліся, як да кампаніі, якія сёньня пачынаюцца, а праз некаторы час канчаюцца. Зразумела, гэты няправільны погляд дрэнна адбіваецца на пасьпяховасьці іх правядзеньня.

Цікавыя лічбы росту камсамолу: на 1-е студзеня 1928 г. УсеЛКСМ налічваў у сваіх радох 1937 тысяч чалавек. На 1-е студзеня бягучага году рады нашай арганізацыі вырасьлі да 2.245.630 чалавек.

У пінэрарганізацыі на 1-е студзеня 1928 г. было 1.682 тысячы дзяцей, на 1-е студзеня г. г.—1.790.575 дзяцей. ЦК УсеЛКСМ ставіць пытаньне аб тым, каб значна павялічыць рады пінэрарганізацыі.

Шмат увагі ўдзяліў дакладчык пытаньням падрыхтоўкі кадраў кваліфікаванай сілы і сыстэме асьветы.

Дакладчык падаў рад лічбаў, якія малюць становішча рабочай моладзі ў ФЗУ, прафтэхшколах і ЦПП.

Па дакладу тав. Андрэева пачаліся спрэчкі.

С. Г.

Выросьлі на 215 чал.

(Партарганізацыя №-скай Беларускай стрэлковай дывізіі)

За першую чвэртку бягучага году наша партарганізацыя прыняла ў свае рады 216 чалавек. Рабочых сярод прынятых — 32 чалавекі, рэшта сяляне. Гэтыя лічбы вельмі цікава параўнаць з лічбамі росту арганізацыі за гэты-ж пэрыяд мінулага году. Яна летась за першую чвэртку году прыняла ў партыю 16 рабочых і да 30 чалавек сялян. Як бачыце, яна расла ў процілегласьць гэтаму году, галоўным чынам, за лік сялян.

Аднак, калі мы прагледзім склад прынятых і ў гэтым годзе, дык убачым, што сярод сялян значны процант займаюць сераднякі і малы процант—беднякі. Трэба ячэйкам узяць курс на тое, каб сярод сялян-партыйцаў быў павялічан процант беднаты.

А. КАЛЮТКО.

Партыйная хроніка

ПЛЕНУМ ГОМЕЛЬСКАГА АК І АКК КП(б)Б

Гэтымі днямі адкрыўся аб'яднаны пленум Гомельскага акруткому і АКК КП(б)Б. На парадку дня пастаўлены пытаньні: 1) Даклад бюро акруткому і намячэньне практычных мерапрыемстваў на ажыцьцяўленьні і правядзеньні ў жыцьцё пастаноў 16 партканфэрэнцыі, 2) Аб зьніжэньні сабекошту прадукцыі прамысловасьці і 3) Аб партасьвеце.

ПЕРШЫ ВЫПУСК УСЕБЕЛАРУСКАЙ САЎПАРТШКОЛЫ

Адбыўся першы выпуск усебеларускай саўпартшколы (у г. Гомелі). 149 пэрыкіраваных работнікаў накіроўваюцца ў вёску. За два гады вучобы курсанты атрымалі вялікую палітычную і агульнаадукацыйную падрыхтоўку. Курсанты будучы ў школе кіравалі гуртками на прадпрыемствах.

НАРАДА САКРАТАРОЎ ВЯСКОВЫХ ПАРТ'ЯЧЭЕК

Скончылася акруговая нарада сакратароў сельскіх парт'ячэек. Нарада выявіла, што большасьць з іх значна палітычна вырасьлі.

Усе пытаньні ўдзельнікі нарады абмяркоўвалі вельмі актыўна. Нарада абавязала кожнага сакратара [illegible] гасаў і іншых рідаў вытворчага аб'яднаньня. У адносінах вярбоўкі батракоў у партыю нарада намецілі рад практычных мерапрыемстваў, накіраваных на пасьпяховае выкананьне дырэктыў у гэтым пытаньні. Нарада таксама наметіла мерапрыемствы па паляпшэньні работы з беднатой і батрацтвам.

Чыстка партыі і масавая работа на прадпрыемстве

Распачатая чыстка партыі павінна стаць важнейшым сродкам умацаваньня авангардная ролі партыі, яе сувязі з рабочай клясай, яе ідэёвай згуртаванасьці і гатоўнасьці да перамогі трудзящайшай сацыялістычнага будаўніцтва. Умацаваньне партыі, як авангарду пралетарыяту, ня можа ня ісьці побач з усямерным разьвіцьцём работы партыі ў масах. Больш таго, сама чыстка, у працэсе яе правядзеньня, павінна стаць важнейшай прыладай разгортваньня масавай работы. Пастановы XVI партканфэрэнцыі наступным чынам вызначаюць гэту задачу:

«Чыстка павінна... умацаваць работу арганізацыі, праверыць работу ячэйкі, стварыць больш таварыскія адносіны паміж членамі партыі, павысіць пачуцьці адказнасьці кожнага за палітыку, за лёс усёй партыі, даць штуршок да павышэньня ўзроўню палітычных ведаў, узмацніць барацьбу з бюракратызмам, павысіць актыўнасьць усіх членаў арганізацыі, узмацніць сувязь іх з масамі рабочых і сялян, узмацніць актыўны ўдзел у сацыялістычным перабудаваньні вёскі, у рацыяналізацыі вытворчасьці і кіраўніцтва, ва ўзьнятьці працоўнай дысцыпліны, у выкараненьні ўсялякага роду раскошы і г. д.».

З гэтага ясна, што чыстка партыі павінна быць тычыльна ўвязана з партыйнай работай у масах. У сваім вядомым артыкуле «Чыстка партыі» (т. XVI, ч. 1, стар. 360) Ленін пісаў:

«Ёсьць месцы, дзе чысьцяць партыю, апіраючыся, галоўным чынам, на практыку, на ўказаньні беспартыйных рабочых, кіруючыся іх указаньнямі, лічачыся з прадстаўнікамі беспартыйнай пралетарскай масы. Вось гэта самае кантоўнае, самае важнае. Калі-б нам сапраўды ўдалося **такім чынам** ачысьціць партыю зьверху да нізу, «ня гледзячы на асобы», заваяваньне рэвалюцыі было-б на самой справе буйное».

Гэта вынятка падаецца даволі часта і добра вядома. Значна радзей цытуецца тое, што Ленін пісаў у тым-жа артыкуле далей. А між тым, Ленін далей матываваў, чаму ён лічыць чыстку партыі з прыцягненьнем беспартыйных буйным заваяваньнем рэвалюцыі. Ленін пісаў:

«... заваяваньні рэвалюцыі цяпер ня могуць быць такімі-ж, як і раней. Яны няўхільна зьмяняюць свой характар у залежнасьці ад пераходу з ваеннага фронту на гаспадарчы... У такі час галоўным заваяваньнем рэвалюцыі становіцца паляпшэньне ўнутранае, не яскравае, якое ня кідаецца ў вочы, якога ня відаць адразу, паляпшэньне працы, яе пастаноўкі, яе вынікаў, паляпшэньне ў сэнсе барацьбы супроць уплываў дробна-буржуазнай і дроб

Ад параднасьці да дзелавога кіраўніцтва!

НЯ УСЮДЫ ЯШЧЭ ПРАФОРГАНЫ ВЕДАЮЦЬ, ЯК ІДЗЕ СПАБОРНІЦТВА У ЦЭХАХ

САЦЫЯЛІСТЫЧНАЕ СПАБОРНІЦТВА ПАТРАБУЕ ПАВЫШЭНЬНЯ АКТЫЎНАСЬЦІ ВЫТВОРЧЫХ НАРАД

З дакладу тав. РОЗІНА

I.

Задачы сацыялістычнай перабудовы краіны, пастаўленыя перад рабочай клясай камуністычнай партыяй, барацьба за кутчэйшы тэмп індустрыялізацыі,—кажа **т. Розін**,—узьнялі хвалю ініцыятывы рабочых мас у справе перамогі дзікасьцяй сацыялістычнага будаўніцтва. Агляд вытворчых нарад і пачатае на ініцыятыве камсамолу сацыялістычнае спаборніцтва моладзі сустрэлі актыўнае падтрыманьне шырокіх рабочых мас і пераварыліся ў спаборніцтва ўсёй масы рабочых за павялічэньне прадукцыйнасьці працы і ўзьняцьця працоўнай дысцыпліны.

Што даў агляд вытворчых нарад

Агляд вытворчых нарад на ВСНР пачаўся з спазьненьнем. У пачатку агляду работа разгарнулася слаба, задачы агляду ня былі растлумачаны шырокім масам. Толькі пачынаючы з лютага мы наглядаем паступовы пералом.

Асноўны вынік кампаніі—**рост актыўнасьці** рабочых мас, праяўленьне арбочымі вялікай ініцыятывы ў справе паляпшэньня і рацыяналізацыі вытворчасьці. **У часе агляду быў створан пералом у рабоце вытворчых нарад**, дзейнасьць апошніх значна ажывілася.

Тав. Розін дае аналіз прапаноў рабочых у часе агляду. Пераважная большасьць прапаноў датычыць паляпшэньня вытворчасьці. Вельмі мала прапаноў, накіраваных на паляпшэньне вытворчых нарад.

На заводзе «Энэргія», напрыклад, з 72 прапаноў 62—вытворчага характару і толькі 8 датычаць работы вытворчых нарад. На Гомельскім заводзе «Пралетары» паступіла 151 прапанова, і ўсе яны накіраваны на рацыяналізацыю вытворчасьці.

Тав. Розін спыняецца на адмоўных моментах агляду.

Дасягненьні агляду не замацаваны

Пералом у рабоце вытворчых нарад не замацаваны. Пасьля агляду вытворчыя нарады пачалі працаваць, як і раней. **Прафарганізацыі не змаглі скарыстаць уздым рабочых мас** у часе агляду, шырокая рабочая **ініцыятыва ня сустрэла належнага падтрыманьня з боку гаспадарчых органаў.** Наглядаецца рад выпадкаў, калі каштоўнейшыя прапановы рабочых, прынятыя ў часе агляду, не праводзяцца ў жыцьцё і тым самым выявіліся халастым стрэлам. **На радзе прадпрыемстваў да гэтага часу не падведзены вынікі агляду** і ніхто ня ведае, што канкрэтна даў агляд. **Матар'ялы агляду большасьцю прафарганізацый не апрацаваны.** Ня зьвернута ўвага на аднаўленьне работы часовых кантрольных камісій. **Фонды прэміяваньня за лепшыя прапановы амаль што не скарыстаны.** Агляд выявіў, што новыя кадры рабочых ня былі ўцягнуты ў работу вытворчых нарад.

Трэба, каб прафарганізацыі тэрмінова прыступілі да дасканалага вывучэньня вынікаў агляду. Фабзаўкомы павінны ўлічыць усе прапановы, прынятыя на аглядавых сходах, і дабіцца рэалізацыі ўсіх больш-менш каштоўных вытворчых прапаноў.

Першыя вынікі сацыялістычнага спаборніцтва

Тав. Розін перайшоў да характарыстыкі сацыялістычнага спаборніцтва. Па матар'ялах ЦСПСБ у спаборніцтва ўступіла 110 прадпрыемстваў, галоўным чынам, рэспубліканскай прамысловасьці. Слаба ўцягнуты ў спаборніцтва прадпрыемствы мясцовай прамысловасьці. Асноўны становчы момант спаборніцтва—гэта вялікага палітычны ўздым рабочай масы. У выніку кампаніі па ўзьнятьню прадукцыйнасьці працы і працдысцыпліны, а таксама сацыялістычнага спаборніцтва ва многіх прадпрыемствах значна зьменшыліся прагулы і павялічылася выпрацоўка прадукцыі. На фабрыцы абутку замест 800 пар выробляецца 900, на гарбарні «Вальшавік» больш за 160 рабочых падалі заявы аб павялічэньні норм, выпуск прадукцыі машынабудаўнічых заводаў павялічыўся на дзесяткі процантаў, у друкарні Палесдруку гнум паперы зьменшыўся ў 4 разы і г. д.

Сацыялістычныя дагавары паступова пазбаўляюцца ад агульных гучных фраз, ад «100 процантных» абяцанак і набываюць канкрэтныя практычныя формы. Аднак, і да гэтага часу ня ўжыты недарэчнасьці першапачатковага арганізацыйнага парыду.

Парадныя выступленьні замест сур'ёзнай работы

Ёсьць выпадкі, калі ініцыятары спаборніцтва гонящца за колькасьцю, забываючы пра якасьць, калі кіраўнікі, бяз ведама мас, уступаюць у спаборніцтва. У Бабруйску фабкомы некаторых прадпрыемстваў харчовай і дрэваапрацоўчай прамысловасьці ўступілі ў спаборніцтва, ня ўзьвяўшы нават пытаньня на рабочых сходах.

Мясцком МЦРК разаслаў усім урачыстыя тэлефанограмы: «Усім, усім. Мы ўступаем у спаборніцтва». А калектыў нават ня ведаў аб гэтым кроку свайго мясцкому. Начальнік аднаго вучастку чыгункі так разышоўся, што выклікаў на «спаборніцтва» цэлых 5 дарог. Гэткія «спаборніцтвы» толькі дыскрэдытуюць самую ідэю вялікага пачынаньня. Нашы прафарганізацыі не даволі глыбока растлумачылі працоўным асноўную ідэю сацыялістычнага спаборніцтва. Многія лічаць, што спаборніцтва—«часовая кампанія». Трэба шырокага растлумачыць рабочым задачы сацыялістычнага спаборніцтва.

Слабое кіраўніцтва прафарганізацый

На абедзьве нагі кульгае жывое кіраўніцтва спаборніцтвам, прафарганізацыі не правяраюць, што робіцца на мясцох. На гуце імя Домбаля месяц назад абвясьцілі спаборніцтва і толькі зараз прыступілі да практычнай працы.

Прамысловыя прадпрыемствы захапляюцца дагаварамі паміж сабой, ня цікавячыся тым, ці дазваляюць умовы прадпрыемства ўступаць у спаборніцтва. Толькі за апошні час спаборніцтвы перашлі ў вышэйшую фазу—спаборніцтвы паміж асобнымі цэхамі аднаго прадпрыемства, паміж асобнымі рабочымі аднаго цэху.

Вельмі слаба кіруюць спаборніцтвам вытворчыя камісіі. Ва многіх мясцох створаны спэцыяльныя штабы, тройкі, пяцёркі. Між тым, асноўнае кіраўніцтва спаборніцтвамі **павінны ўзяць на сябе прафарганізацыі праз свае вытворчыя камісіі.** Гэта іх асноўная задача ў сучасны пэрыяд.

Тав. Розін адзначае вельмі слабую ўвязку спаборніцтва **з культурнай работай прафсаюзаў.** Сацыялістычныя спаборніцтвы ўсім не адбіліся ў рабоце клюбаў, чырвоных куткоў і насьцягазэт. Апошнія стаяць у баку ад гэтай важнейшай работы. Трэба ўсю сыстэму культурных мерапрыемстваў прыстасаваць да максымальнага абслугоўваньня сацыялістычнага спаборніцтва.

Што паніжае моц хвалі

Нарэшце, тав. Розін спыняецца на адносінах гаспадарчых арганізацый да спаборніцтваў. Пасьпяховасьць апошніх залежыць ад усёй абстаноўкі працы на прадпрыемстве. Між тым, на многіх заводах тэхнічныя няўвязкі, недахват сырцу, дрэнная абсталяваньне зрываюць эфэктыўнасьць работы. На некаторых прадпрыемствах, побач з зьмяншэньнем прагулаў, вырасьлі тэхнічныя прастоі. Адбіваецца на спаборніцтвах і дрэнная якасьць сырцу. Ні ў якім разе нельга дапусьціць, каб вытворчыя ненарадкі аслаблялі моц хвалі вялікага энтузіязму. **Слаба ўцягнуты ў спаборніцтва інжынэрна-тэхнічныя сілы.** Міжсаюзнае бюро ІТС не прыняло амаль ніякага ўдзелу ў сацыялістычным спаборніцтве рабочае клясы.

У заключэньне **т. Розін** адзначыў, што сацыялістычнае спаборніцтва павінна знайсьці поўны адбітак ва ўсёй рабоце прафэсыянальных арганізацый.

Спрэчкі па дакладу тав. Розіна

Аб парадных выкліках і слабым праф. кіраўніцтве

Члены пленуму ЦСПСБ, выступаўшыя па дакладу т. Розіна, амаль не супярэчылі супроць асноўных палажэньняў дакладу і дапоўнілі яго радам новых цікавых даных.

Аказваецца, «парадныя» спаборніцтвы мелі месца ў розных акругах. Ці дрэваапрацоўшчыкаў заяўляе, што па саюзе заключана 19 дагавароў, між тым яно не заўважыла, што некаторыя з гэтых дагавароў зьяўляюцца плянам канцылярскай творчасьці, а не ініцыятывы мас.

Тав. **Кейлін**, напрыклад, апавядае аб «урачыстым» выступленьні Бабруйскага аддзяленьня транспартных рабочых, якое выклікала ўсе аддзяленьні БССР, зусім ня ўзьвяўшы гэтага пытаньня на рабочых сходах. Беларуская кантора Саўгандальфлёту ўступіла ў спаборніцтва, не паведаміўшы аб гэтым рабочых.

Тав. **Бэрына** прыводзіць выпадак, калі Магілёўская фабрыка цукерак выклікала Менскую, не прапрацаваўшы дасканала гэтага пытаньня, не зацікавіўшыся тым, ці аднолькавыя ўмовы работы на абедзьвюх фабрыках.

Амаль усе прамоўцы адзначалі, што тэхнічныя няўвязкі на вытворчасьці, недахват сырцу, слабое абсталяваньне, халодныя адносіны адміністрацыйна-тэхнічнага пэрсаналу перашкаджаюць спаборніцтву, распыляюць магутную хвалю сацыялістычнага энтузіязму.

Прафарганізацыі вельмі слаба кіруюць спаборніцтвамі. Некаторыя з іх абмяжоўваюцца перадрукаваньнем дыректыў вышэйшых арганізацый. У Полацкай акрузе зусім не прапрацавана адозва 16 партканфэрэнцыі да рабочых.

Па думцы выступаўшых кіраўніцтва спаборніцтвамі павінны ўзяць на сябе вытворчыя камісіі.

Старшыня ўсебеларускага бюр УТС т. **Каплан** падкрэсьліў неабходнасьць самай сур'ёзнай падрыхтоўкі і прапрацоўкі сацыялістычных дагавароў. Нельга надыходзіць да спаборніцтваў, як да звычайнай кампаніі, спаборніцтвы—гэта карэнная ломка ўсёй абстаноўкі, работы на прадпрыемствах, капітальная ломка ўсёй псыхалёгіі рабочага, матар'яльная зацікаўленасьць уступае месца сьвядомасьці будаўніка сацыялізму. Вось чаму нельга захапляцца колькасьцю дагавароў за кошт якасьці.

Прамоўцы спыніліся на выніках агляду вытворчых нарад і згадзіліся з тым, што вынікі не замацаваны, актыўнасьць мас не скарыстана ў належнай меры, шмат каштоўных прапаноў ляжыць у папках аглядавых і вытворчых камісій. Рэдка, рэдка дзе падведзены вынікі агляду, адміністрацыя ўхіляецца ад прэміяваньня, кажучы, што «ў прапановах няма нічога новага».

Гэтым закончылася першае пасяджэньне.

Б.

Прафсаюзны актыў ня кіруе спаборніцтвам

Адміністрацыя—у ролі глядача

Працяг спрэчак па дакладу тав. Розіна

На ўчарашным раніпнім пасяджэньні працягвалася спрэчкі па дакладу т. Розіна аб сацыялістычным спаборніцтве ў беларускай прамысловасьці.

— Практычна,—кажа **т. Руманаў**,—мы яшчэ дасягнулі вельмі мала, ня гледячы на тое, што спаборніцтвы цягнуцца ўжо больш, чым паўтара месяца. Спачатку былі горача ўзяліся за справу, а потым... пайшло таксама, як з усякай «кампаніяй».

Дзе прычына такога становішча?

— У першую чаргу вінаваты **прафсаюзны актыў**, бо ён ня кіруе на мясцох сацыялістычным спаборніцтвам. Актыў абмежаваўся тым, што стварыў штабы, камісіі—і ўсё.

— У другую чаргу вінаваты нашы гаспадарнікі. На радзе прадпрыемстваў мы наглядаем такія выпадкі, калі іх работа затрымліваецца, напрыклад, з-за адсутнасьці дапаможных матар'ялаў. Такое становішча наглядаецца на фабрыках абутку. Адміністрацыя ня прымае энэргічных мер, каб ліквідаваць тыя перашкоды, што стаяць на шляху сацыялістычнага спаборніцтва.

Прафсаюзны апарат ня ведае, што робіцца на мясцох

Наколькі кіруючы прафсаюзны апарат слаба працуе ў галіне разгортваньня сацыялістычнага спаборніцтва, сьведчыць той факт, што **гэты апарат ня ведае, што робіцца на мясцох.**

Ставіць пытаньне аб ліквідацыі зараз спэцыяльных камісій і штабаў спаборніцтва нямэтазгодна, бо мы яшчэ не дабіліся, каб вытворчыя нарады і камісіі сталі больш гібкімі. Кіраўніцтва спаборніцтвам трэба паступова перадаваць з рук штабаў у рукі вытворчых камісій.

Трэба адзначыць тую вялізарную актыўнасьць,—кажа тав. **Грыншпан** з Мазыра,—якая ахапіла рабочую масу ў пачатку сацыялістычнага спаборніцтва.

Яшчэ трэба адзначыць, што прафсаюзы, калі і робяць спробу кіраваць сацыялістычным спаборніцтвам, дык ажыцьцяўляюць гэта вельмі **бюракратычна.** Прадпрыемствы атрымліваюць цыркуляры, напісаныя такой мовай, што іх цяжка і зразумець. Такія цыркуляры застаецца толькі класьці пад сукно.

— І я павінна завастрыць увагу пленуму на тое,—кажа т. Грыншпан,—што адміністрацыя праяўляе мала зацікаўленасьці ў справе спаборніцтва. Толькі гэтым можна растлумачыць факты павялічэньня прастояў на некаторых прадпрыемствах. Трэба ліквідаваць такія настроі, нібы сацыялістычнае спаборніцтва зьяўляецца справай толькі прафсаюзаў і што гаспадарнікі ня маюць да спаборніцтва ніякага дачыненьня.

Трэ' вучыцца ў лепшых

— Зразумела, што сацыялістычнае спаборніцтва разгортваецца ня так, як трэба,—кажа **т. Ісаў**,—але ўсё-ж такі мы маем і некаторыя дасягненьні на гэтым фронце. Сярод рабочых на станцыі Менск мы месяцаў два таму назад мелі 80-85 чалавека-дзён прагулаў на нягрунтоўных прычынах, зараз гэтыя прагулы не перавышаюць 20-25 чалавека-дзён. Раней вытворчая праграма ня выконвалася, зараз яна ўжо перавышаецца.

— **Ні ЦСПСБ, ні цэнтральныя праўленьні саюзаў не зрабілі таго, што трэба ў справе належнай арганізацыі сацыялістычнага спаборніцтва ў беларускай прамысловасьці**,—кажа т. Раеў з Магілева.—Актыўнасьць нізоў прайшла міма нашых прафсаюзаў. Трэба адкрыта прызнаць, што прафсаюзы яшчэ не ўзялі на сябе кіраўніцтва сацыялістычным спаборніцтвам, што яны ня выканалі дырэктыў партыі па гэтым пытаньні.

Не падыходзьце мэханічна

— З тых выступленьняў, якія я тут чуў,—кажа **т. Славінскі**, сакратар Менскага акругкому,—можна зрабіць вывад, што пытаньне аб сацыялістычным спаборніцтве пастаўлена не даволі ясна і выразна. Няма таксама яснасьці ў пытаньні, што нас прывяло ў сучасны момант да сацыялістычнага спаборніцтва і як трэба рухацца наперад, каб замацаваць і пашырыць тыя дасягненьні, што ўжо ёсьць. Вось на гэтыя пытаньні і трэба зьвярнуць асноўную ўвагу.

— Трэба канстатаваць, што сацыялістычнае спаборніцтва праводзіцца яшчэ, як нейкая агітацыйная работа, а ня як вялікае рэальнае мерапрыемства. Вось чаму мы наглядаем чыста мэханічны падыход да справы, вось чаму ў радзе выпадкаў актыўнасьць мас не скарыстана.

Ня біць на колькасьць, а на якасьць

— Чаму сацыялістычнае спаборніцтва не разгортваецца так, як мы-б хацелі? А таму, што на прадпрыемствах дагэтуль яшчэ ня створаны адпаведныя ўмовы работы. У пераважнай колькасьці выпадкаў, напрыклад, на прадпрыемствах няма яшчэ ні норм, ні расцэнак. **Для таго, дасягнуць вялікіх вынікаў, трэба гнацца не за колькасьцю, а за якасьцю.** Трэба, нарэшце, як сьлед, растлумачыць рабочай масе палітычнае значэньне спаборніцтва.

Спаборніцтва—не кампанія

— Тут чутны былі словы аб «кампанействе» сацыялістычнага спаборніцтва. Такую ўстаноўку трэба рашуча адхіліць, бо спаборніцтва—**гэта работа, якая ўводзіцца сур'ёзна і надоўга.** Тут таксама гаварылі ў такім напрамку, нібы вытворчая нарада—гэта адзін бок мэдалі, а сацыялістычнае спаборніцтва—другі бок. Такія думкі зьяўляюцца глыбока памылковымі. **Сацыялістычнае спаборніцтва—непасрэдны працяг вытворчай нарады.** Калі мы мелі на ўвазе пры дапамозе вытворчых нарад уцягнуць рабочага ў агульна-заводзкае жыцьцё, дык пры сацыялістычным спаборніцтве гэты рабочы пераходзіць па больш высокую ступень, уцягваецца яшчэ больш ва ўсеагульную рабочую справу. Сацыялістычнае спаборніцтва накладвае на рабочага высокія і ганаровыя абавязкі.

Зрабіць спаборніцтва сапраўды масавым

— На жаль, **сацыялістычнае спаборніцтва праходзіць у радзе месц чыста бюракратычна;** рабочая маса ў гэтую справу слаба ўцягваецца. Дагавары, напрыклад, распрацоўваюцца ў габінэтах, **а не на шырокіх рабочых сходах.**

—Трэба ў корані зьмяніць існуючы пункт погляду на вытворчыя нарады, нібы яны ўжо аджылі свой век. Наадварот, трэба яшчэ шырэй разгарнуць работу вытворчых нарад, бо пры іх дапамозе мы зможам замацаваць дасягнутыя вынікі ў сацыялістычным спаборніцтве і намеціць яго далейшыя шляхі.

— Нарэшце, трэба дабіцца такога становішча, **каб вытворчыя нарады сапраўды ўцягнулі рабочую масу,** каб гэтая маса сама выяўляла ініцыятыву, каб вытворчыя нарады склікаліся ня толькі па ініцыятыве фабкому і адміністрацыі, а галоўным чынам па ініцыятыве радавых рабочых.

В.

Дзеньнік пленуму

На раніпнім пасяджэньні 11-га чэрвеня працягваліся спрэчкі па дакладу т. Розіна. У спрэчках выступілі т. т. **Грыншпан** (Мазыр), **Мяцельскі, Касьцючэнка** (Гомель), **Ковенскі** (Віцебск) **Славінскі** (сакратар Менакругкому КП(б)Б) і інш.

Усяго на раніпнім пасяджэньні у спрэчках па дакладу т. Розіна выказалася каля 20 членаў пленуму. Потым пленум заслухаў заключнае слова т. Розіна.

Вячэрняга пасяджэньня учора ня было.

ПРАСПАЛІ...

(Гісторыя аднаго спаборніцтва)

Спаборніцтва — рэч добрая, патрэбная і карысная, але калі яно праходзіць бяз сыстэмы, бяз пляну, без кіраўніцтва — гэта не спаборніцтва, а пакута.

Так было в нашым МЦРК, які парашыў уступіць у спаборніцтва. Мясцкомы МЦРК, эканомкамісіі сталі рыхтавацца да спаборніцтва, але ня ведалі, з чаго пачаць, чакалі кіраўніцтва свайго «штабу»—цэнтральнага праўленьня саюзу, а праўленьне чакала пакуль цэрабкопаўцы пачнуць спаборніцтва.

— Што яны — маленькія. Самі могуць наладжваць спаборніцтвы, мы ня нянькі. Няхай пачнуць, а мы дапаможам...

Так гаварылі кіраўнікі саюзу.

І вось цэрабкопаўцы парашылі склікаць шырокі сход, каб абмеркаваць усе дэталі спаборніцтва, заключэньня дагавароў. Умовіліся з працаўнікамі саюзу і вызначылі дзень сходу.

Але кіраўнікі саюзу, занятыя, як відаць, больш сур'ёзнымі і важнымі пытаньнямі, зусім забылі пра іх і не зьявіліся на гэты сход. Зразумела, сход не адбыўся...

Гэтымі днямі ЦП саюзу выклікала да сябе для «ўнушэньня» старшынь цэрабкопу.

— Дзе ваша спаборніцтва? Чаму вамі нічога ня прынята? Чаму вы нічога ня робіце? — Пасыпаліся папрокі з вуснаў кіраўнікоў саюзу. Прадстаўнікі цэрабкопу аслупянелі, зьбялелі і ня ведалі, што адказаць свайму кіруючаму органу...

— А, маўчыце! Згаджаецеся... Вы праваліл спаборніцтва. Ня добра, таварышы, так нельга...

Але калі яны ачухаліся ад нечаканага наступленьня кіраўнікоў саюзу, мясцкомаўцы, успомніўшы аб самакрытыцы, сталі бічаваць так свой «штаб», што ў працягу некалькіх хвілін ролі зьмяніліся, і цэнтральнае праўленьне саюзу замест абвінавачэньняў абярнулася ў абвінавачанага.

— Як-жа гэта. На працягу месяца крычым аб спаборніцтве, прасілі ў вас інструкцый, прасілі вас даць нам паказаньні, як правесьці спаборніцтва, назначылі агульны сход, вы яго сарвалі, а цяпер прыходзіце да нас з прэтэнзіямі...

Наступіла жахлівае маўчаньне, зьніклі словы, канулі ў вечнасьць папрокі...

***

Хто тут вінаваты—ясна, што ЦП саюзу, якое спадзявалася, што мясцкомы самі ўсё зробяць.

Але мы лічым, што яшчэ ня позна, спаборніцтва паміж магазынамі цэрабкопу, паміж складамі, паміж аддзеламі павінна быць праведзена. Вельмі многа скаргаў на цэрабкоп. Патрэбна спаборніцтва, яно аздаровіць апарат МЦРК і створыць такія ўмовы, пры якіх работа пойдзе лепш. Саюз павінен на гэта пытаньне зьвярнуць больш увагі, не ўваходзіць у палеміку з мясцкомамі, а дапамагчы ім наладзіць спаборніцтва.

СТРЭЛАЧНІК.

Аб кіраўніцтве трэсту і... вяроўках

Да сакавіка г. г. становішча заводу «Зьвязда» (ст. Капцэвічы) было дрэннае. Працоўная дысцыпліна нізкая, шмат прагулаў, якасьць фанэры—кепская, таксама прадукцыйнасьць працы...

Але пасьля таго, як усе недахваты былі абгавораны на вытворчых нарадах і агульных сходах рабочых, пасьля ўступленьня ў сацыялістычнае спаборніцтва, становішча заводу адразу зьмянілася. Прагулы амаль што зусім зьнішчаны. Працоўная дысцыпліна паднята па належны ўзровень. Павялічылася і колькасьць і якасьць гатовай прадукцыі. Калі да 1-га красавіка выпускалі ад 1.080 да 1.115 к.м. фанэры, то красавік даў 1.496 куб. мэтраў, а май 1.505 куб. мэтраў фанэры. Процант экспарту павялічаны да 45 проц. усёй прадукцыі, чаго раней ня было. Настрой рабочых заводу «Зьвязда» вельмі ўзьняўся пасьля першых перамог на гаспадарчым фронце і ўсе аднагалосна гаворыць, што пойдуць далей, ня спыняючыся на гэтым.

Але ў рабоце заводу ёсьць і недахваты. Галоўным чынам гэта **недахват вяроўкі** для ўпакоўкі фанэры. Фанэру прыходзіцца вывозіць на склад і там яе пакаваць, што бязмоўна каштуе даражэй.

Зараз некалькі слоў аб кіраўніцтве з боку трэсту. У першых лічбах чэрвеня дырэктар заводу атрымаў ад трэсту загад наступнага зьместу: « у выніку таго, што на заводзе ёсьць шмат недахватаў... (ідзе пералічэньне іх) трэст прапануе зараз-жа прыступіць да зьнішчэньня іх».

Увесь загад зьяўляецца амаль што выняткам з пратаколаў вытворчых нарад пры заводзе за сакавік месяц г. г. і нават ранейшых. Усе пералічаныя ў загадзе недахваты **выкрыты самімі рабочымі** і амаль што **ўсе зьнішчаны**, а трэст зараз толькі дадумаўся да гэтага.

Вось як Лесбел кіруе заводамі.

На вытворчай нарадзе, якая адбылася ў пачатку чэрвеня 1929 г., рабочыя, даведаўшыся аб такім загадзе, проста ўхвалілі пастанову: **«прасіць трэст паменшыць пісаніну непатрэбных загадаў, а больш увагі аддаць прысылцы патрэбных матар'ялаў, каб выканаць поўнасьцю вытворчую праграму і дырэктывы партыі і ўлады».**

І. Г.

Акружцыдуленьне пяцігадовага пляну значна ўмацуе абароназдольнасьць СССР

Мы павінны ўлічваць, што клясавая барацьба паміж працаю і капіталам ня скончылася, што Савецкі Саюз ня толькі знаходзіцца ў капіталістычным акружэньні, але, як адзіная дзяржава рабочых і сялян, зьяўляецца буйнейшай сілай ва ўсёй сусьветнай барацьбе пралетарыяту і сялянства. Таму, складаючы пяцігадовы плян, мы павінны рыхтавацца і да таго, каб, у выпадку патрэбнасьці нераходу да ўзброенай абароны, аказацца гатовымі да таго, каб вытрымаць удар.

У дырэктывах партыі і зьезду саветаў, якія даны перад канчатковым складаньнем пяцігадовага пляну народнае гаспадаркі, з гэтага поваду зусім выразна, што мы бязупынна павінны ўмацоўваць абароназдольнасьць краіны, матэрыяльнасьць і баяздольнасьць Чырвонай армії, паветранага і марскага флёту, накапляць спэцыяльныя рэзэрвы абароны, удзяляць максымальную ўвагу хутчэйшаму разьвіцьцю тых галін народнае гаспадаркі наогул і прамысловасьці ў прыватнасьці, на якую прыпадае галоўная роля ў справе абароны. У гэтых дырэктывах паказваецца, што супрацьўленьне варожаму нападу можа быць арганізавана з выстарчальнай сілай толькі ў тым выпадку, калі транспарт, прамысловасьці, народная гаспадарка і дзяржаўны апарат у цэлым здолеюць хутка перайсьці на работу ў ваенных умовах і найбольш прыстасавацца да патрэб і ўмоў абароны. Абароназдольнасьць дзяржавы ні ў якім выпадку не павінна адставаць ад агульнага росту народнае гаспадаркі краіны. Мы не павінны забываць, што сучасная вайна вядзецца не аднымі толькі ўзброенымі сіламі. У яе ўцягваюцца ўсе сілы і ўсе сродкі дзяржавы.

Цяпер пяцігадовы плян зацьверджаны. Разгледзім, у якой меры ўлічаны ў ім інтарэсы абароны краіны. Спынімся толькі на самых галоўнейшых пытаньнях.

Мы добра ведаем, што з наступленьнем вайны вялікая колькасьць людзей будзе адцягнута ад мірнае вытворчае працы. Яны будуць са зброяй у руках змагацца на палёх вайны, а на многіх фабрыках і заводах будуць выробляць не прадметы мірнага спажываньня, а балвыя прыпасы, якія патрабуюць вялікай колькасьці мэталю, хэмічных прадуктаў і іншага сырцу. Армія патрабуе, акрамя таго, значнага выключэньня з народнае гаспадаркі конскага складу. З пункту погляду абароны краіны таму мае вялікае значэньне разьвіцьцё скарыстаньня тэй энэргіі, якую мы можам атрымаць ад натуральных сіл прыроды, каб вызваліць для вядзеньня вайны біз страты для гаспадаркі патрэбныя людзкія сілы.

Паводле пяцігадовага пляну прадугледжваецца давядзеньне вырабу электрычнай энэргіі з 5 мільярдаў кілёват—гадзін у 1927-28 г. да 22 мільярдаў. Дзякуючы такім дасягненьням у галіне электрыфікацыі, мы ў выпадку вайны, з аднаго боку, лягчай здолеем выйсьці з труднасьцяй, зьвязаных з адцягненьнем жывой рабочай сілы, а з другога—уніканць найскладнейшых затрудненьняў на апалавым фронце, паколькі мы праз электрыфікацыю шырока скарыстаем розныя віды мясцовага апалу. Акрамя таго, на працягу пяцігодзьдзя зьніжаецца роля энэргіі рабочае жывёлы. Само сабою зразумела, што гэта палегчыць становішча з фуражом для яе пракорму.

Яшчэ ня згладзіліся ў памяці тыя труднасьці, якія нам прыходзілася цярпець у часе грамадзянскай вайны з-за недахвату апалу, калі апалу но хапала ня толькі для хаця-б мінімальнага ацяпленьня кватэр, але скрозь і ўсюды і для вытворчасьці і чыгунак. Запраектаваная ў пляне праграма зусім адпавядае задачам у гэтых адносінах. Па апале намечаны граніцны заданьні з скарыстаньнем усіх вытворча-тэхнічных магчымасьцяй. Надзвычайна важна і тое, што намячаецца больш эканомнае скарыстаньне апалу (у каменна-вугольнай прамысловасьці выдаткі апалу на адзінку прадукцыі скарачаюцца на 15 проц., у мэталюргічнай—на 30 проц. і на транспарце на 25 проц.).

Ці трэба тлумачыць, якое значэньне мае рост вырабу чыгуну, разьвіцьцё машынабудаўніцтва, трактарабудаўніцтва і вытворчасьці сродкаў вытворчасьці. Наша вызваленьне ад замежнай залежнасьці ў важнейшых машынах, варштатах—адна з умоў, якая забясьпечвае абароназдольнасьць нашай краіны. Не патрабуе асобых тлумачэньняў і намечанае разьвіцьцё транспарту, які мае ў сучаснай вайне проста рашаючае значэньне ў сувязі з вялікай рухомасьцю ваенных аэраплян. Тут і новае будаўніцтва чыгунак, і ўзмацненьне пропускной здольнасьці існуючых, і пераход на больш удасканаленыя тыпы рухомага складу і іншыя мерапрыемствы, намечаныя да ажыцьцяўленьня на працягу пяцігодкі, дыктуюцца ня толькі мірнымі задачамі, але і інтарэсамі абароны.

Асобна трэба адзначыць разьвіцьцё дзьвёх новых галін: грамадзянскай авіяцыі і аўтатранспарту. Тут нам прыходзіцца пачынаць з пустога месца. Ад старой царскай Расіі нам нічога не засталося. Усё, што мы маем цяпер у галіне паветранага флёту,—гэта цалкам і поўнасьцю нашы ўласныя дасягненьні. Да канцы пяцігодкі паветраная сетка вырастае з 18 тыс. кілёмэтраў да 45 тысяч, перавозкі павялічваюцца амаль у сем раз, аэраздымальныя работы—ў пяць раз, праграма па барацьбе са шкоднікамі ў сельскай гаспадарцы—ў чатыры разы і г. д. Да канца пяцігодзьдзя мы будзем мець звыш 150 тысяч аўтамабіляў уласнае вытворчасьці. Гэта дасьць нам магчымасьць значна ўзмацніць мэханічную цягу ў армії ў ваенны час.

Уся праграма разьвіцьця сельскае гаспадаркі проста і непасрэдна зьвязана са справай абароны. Падцягваньне гэтай галіны, якая адстае ад агульнага разьвіцьця вытворчых сіл краіны, павялічэньне вытворчасьці хлеба і сырцу, усямернае разьвіцьцё аграмадзьнага сэктару сельскае гаспадаркі, павялічэньне таварнасьці яго—усё гэта мае першачарговае значэньне для абароны.

Пералічанага зусім досыць, каб устанавіць той факт, што плян індустрыялізацыі нашае гаспадаркі, увесь плян сацыялістычнага будаўніцтва сапраўды зьяўляецца плянам, які падводзіць надзейную аснову пад абарону СССР. Хто выступае супроць найбольш шпаркага выкананьня гэтага пляну, той вольна ці нявольна грае на руку нашым ворагам.

К. Механошын.

Ці можа беларуская прамысловасьць перайсьці на бесьперабойны вытворчы год?

У гутарцы з нашым супрацоўнікам **намесьнік старшыні ВСНГБ т. Стракоўскі** сказаў наступнае аб ажыцьцяўленьні па беларускай прамысловасьці прапановы, зробленай на апошнім усесаюзным зьезьдзе т. Ларыным:

— Прапанова перавесьці прамысловасьць на бесьперапынны вытворчы год —бязумоўна каштоўная. Гэта прапанова можа быць праведзена ў радзе галін беларускай прамысловасьці. Прынцыпова яна не сустракае перэчаньняў.

Практычна-ж мы натыкаемся на цэлы рад труднасьцяй, якія перашкаджаюць ажыцьцявіць прапанову т. Ларына. Старыя прадпрыемствы БССР, напрыклад, ня могуць працаваць бязупынна круглы год, бо часта патрабуюць спыненьня для рамонту абсталяваньня. На такіх прадпрыемствах абсталяваньне ня вытрымае бязупыннай эксплёатацыі ў працягу цэлага году. Гэта заўвага адносіцца як да вытворчага, так і энэргетычнага абсталяваньня.

У некаторых галінах беларускай харчовай прамысловасьці ўвядзеньне бесьперапыннага вытворчага году пакуль што нельга ажыцьцявіць з тае прычыны, што гэтыя галіны адчуваюць труднасьці збытавога і сыровага характару. Крухмальная прамысловасьць, напрыклад, мае недахват бульбы. Броварная прамысловасьць адчувае збытавыя труднасьці.

Што датычыць новых прадпрыемстваў, дык тут прапанову т. Ларына больш лёгка ажыцьцявіць. Увядзеньне бесьперапыннага вытворчага году на новых прадпрыемствах залежыць, галоўным чынам, не ад абсталяваньня, а ад умоў самой вытворчасьці і працяжнасьці рабочага дня. Да такіх умоў можна, напрыклад, аднесьці ўмовы, у якіх знаходзіцца харчовая прамысловасьць, аб якой я гаварыў вышэй.

Некаторыя прадпрыемствы ВСНГБ, у прыватнасьці панчошна-трыкатажная фабрыка ў Віцебску, распрацоўвалі праекты такой арганізацыі працы, якая-б фактычна выяўляла сабой пераход на бесьперапынны вытворчы год. Панчошна-трыкатажная фабрыкай быў прадстаўлены праект такой сыстэмы работы, якая максымальна загружала-б абсталяваньне і дала-б, дзякуючы гэтаму, магчымасьць павялічыць прадукцыйнасьць на 15-20 проц.

Трэба адзначыць, што пераход на бесьперапынны вытворчы год даў-бы магчымасьць уцягнуць у прамысловасьць значную колькасьць новых рабочых рук. Вялізарнае значэньне такога факту зусім зразумела, калі прыняць пад увагу перанаселенасьць беларускай вёскі.

Падкрэсьліваю, што прапанова т. Ларына вельмі цікавая і карысная рэч. Але рад прычын, якія я ўжо адзначыў, перашкаджаюць хутка ажыцьцявіць гэтую прапанову па ўсёй беларускай прамысловасьці.

У будучым апэрацыйным годзе трэба будзе для практыкі ўвесьці бесьперапынны вытворчы год па некалькіх прадпрыемствах.

Чаму сарвана кантрактацыя сьвіней

Кантрактацыя сьвіней—у нас справа новая. Сялянскае насельніцтва зусім ня было знаёма з ёю. І трэба было шмат папрацаваць, шмат энэргіі аддаць, каб гэту справу ўкараніць сярод сялянскага насельніцтва. І вось, калі папулярызацыя гэтае справы пачала сяк-так наладжвацца, калі можна было прыступіць да ажыцьцяўленьня гэтага мерапрыемства, знайшліся арганізацыі, знайшліся людзі, якія сваімі дзеяньнямі, сьвядома ці несьвядома, пачалі зрываць гэтую кантрактацыю.

Паводле дагавору, Белсельсаюз, атрымліваючы кармы ад Белдзяржгандлю, абавязаўся забясьпечваць гэтымі кармамі ўсіх кантрактантаў як яго ўласных, так і белдзяржгандлеўскіх.

Белдзяржгандаль выдаў Белсельсаюзу кармоў, колькі было патрэбна, акрамя таго, вызначыў сродкі для аванса ваньня сялян грашыма.

І вось тут пачынаюцца брыдкія адносіны-акрсельсаюзаў.

Калі сяляне-кантрактанты Белдзяржгандлю зьявіліся ў Полацкі акрсельсаюз, каб ім далі, што трэба, дык там іх зараз-жа пачалі «агітаваць»:

— Вы, таварышы, кіньце свой Дзяржг

Аблігацыя—сьведка удзелу працоунага у сацыялістычным будаўніцтве

Дзяржпазыкі—доўгатэрміновы крэдыт

За апошнія гады дасягнуты значныя посьпехі ў галіне мабілізацыі сродкаў насельніцтва на патрэбы індустрыялізацыі прамысловасьці і сельскай гаспадаркі.

Другая пазыка індустрыялізацыі, разьлічаная на падпіску сярод рабочых і сялян, дала па БССР звыш 10-мільёнаў руб. Гэта сьведчыць аб тым, што дзяржпазыкі зьяўляюцца вельмі важным фактарам у справе павялічэньня сродкаў на сацыялістычнае будаўніцтва.

На жаль, да гэтага часу шырокія колы насельніцтва не ўявілі сабе значэньня дзяржаўных пазык, як сродку доўгатэрміновага крэдыту. У зьвязку з гэтым наглядаецца часта продаж аблігацый часткай трымальнікаў. Такое зьявішча, зразумела, не дае дзяржаве магчымасьці належным чынам скарыстаць сродкі, атрыманыя ад рэалізацыі пазыкі па іх асноўным прызначэньні—на капітальнае будаўніцтва; гэта ў значнай ступені адбіваецца на плянах разьвіцьця народнае гаспадаркі, пабудаваных і на ўліку вольных сродкаў насельніцтва. З агульнай сумы выдаткаў на гаспадарчае будаўніцтва ў 1928-29 г. сродкі, уцягнутыя праз дзяржпазыкі, складаюць 36 проц.

Акрамя гэтага трымальнік пазыкі можа скарыстаць тыя выгады, якія дзяржпазыкі даюць (выйгрышы, процанты) толькі пры ўмове, калі аблігацыі дзяржпазык застануцца ўласнасьцю падпісчыкаў на працягу значнага пэрыяду часу.

У інтарэсах падпісчыкаў і дзяржавы, каб аблігацыі 2-й пазыкі індустрыялізацыі засталіся ў распараджэньні трымальнікаў.

Зараз уводзіцца калектыўная перадача на хаваньне аблігацый дзяржпазык..

Аблігацыі захоўваюцца ашчадкасамі і дзяржбанкам дармова. Трымальнік вызваляецца ад усякіх клопатаў, яму даецца магчымасьць найбольш зручна карыстацца сваімі аблігацыямі і праз касу рабіць патрэбныя апэрацыі.

Шырокія колы працоўнага насельніцтв з вялікім спачуваньнем аднесьліся да гэтага мерапрыемства. Па БССР, як і ва ўсім Саюзе, разгарнулася кампанія калектыўнай перадачы на хаваньне аблігацый, набытых у парадку калектыўнай падпіскі.

Камісіі садзэйнічаньня, што існуюць па паасобных прадпрыемствах і ўстановах, якія рэарганізуюцца ў пастаянныя камісіі, павінны прыняць самы актыўны ўдзел ў гэтай працы і арганізаваць усю гэтую работу з такім разьлікам, каб заявы кожнага працоўнага былі ў хутчэйшы час запоўнены і пераданы калектыўна ў ашчадкасы ці Дзяржбанк.

Крэдытныя ўстановы павінны ўзмацніць сваю сувязь з паасобнымі калектывамі і прыняць самыя рашучыя меры да належнае пастаноўкі гэтае працы і своячасовай выпіскі захаваўча-навычковых пасьведчаньняў.

Падольскі.

НЕ ПРАДАВАЦЬ АБЛІГАЦЫЙ 2-Й ПАЗЫКІ

— Агульны сход рабочых і служачых ДРУКАРНІ І РЭДАКЦЫІ ГАЗ. «ЗЬВЯЗДА» пастанавіў здаць усе аблігацыі другой пазыкі індустрыялізацыі на хаваньне ў дзяржаўнай касе ашчаднасьці.

Сход выклікаў 1-ю дзярждрукарню і ўсе рэдакцыі Менскіх газэт і пасьледавацьць прыкладу «зьвяздоўцаў».

* * *

— Агульны сход рабочых і служачых БЕЛЬСЕЛЬТРЭСТУ прызнаў, што пасьпяховае выкананьне пяцігодкі патрабуе самага шырокага ўдзелу працоўных мас у будаўніцтве сацыялізму і актыўнай дапамогі дзяржаве.

Сход пастанавіў здаць аблігацыі пазык на калектыўнае хаваньне ў банк і атрымліваць кожны месяц зарплату праз касу ашчаднасьці.

ПАСТАНОЎЛЕНА ПРАСІЦЬ УРАД ВЫПУСЬЦІЦЬ 3-Ю ПАЗЫКУ ІНДУСТРЫЯЛІЗАЦЫІ.

Сход выклікаў калектывы Менакрза і Белсельсаюзу.

Як ідзе падрыхтоўка да арганізацыі ўсебеларускай выстаўкі

НКЗ і ВСНГБ вельмі слаба удзельнічаюць у падрыхтоучай рабоце

Пастанова ўраду аб арганізацыі 1-й усебеларускай выстаўкі сельскай гаспадаркі і прамысловасьці была ўхвалена яшчэ 26-XI 1927 г. Уся адказнасьць за набудову, арганізацыю і дзейнасьць выстаўкі была ўскладзена на НКЗ і ВСНГБ. З таго часу мінула роўна год і наўтара месяцы, і ніхто палец аб палец ня ўдарыў, каб пачаць выконваць закон ураду.

Толькі 10 студзеня г. г. быў складзены галоўвыстаўком і назначана дырэкцыя, якая прыступіла да падрыхтоўкі да выстаўкі. Шмат часу прышлося затраціць, каб разварушыць установы, каб дабіцца хаця-б некаторых установак з боку НКЗ, ВСНГ і навукова-дасьледчага інстытуту.

На першым пасяджэньні галоўвыстаўкому былі намечаны мэтады і маштабы будаўніцтва выстаўкі, праект падрыхтоўкі тэрыторыі для выстаўкі і іншыя арганізацыйныя пытаньні. На падставе гэтых намячэньняў камітэт выстаўкі прыступіў да канкрэтнай работы. Быў даны рад заданьняў установам, НКЗ было даручана напісаць спэцыяльную брашуру «Рыхтуйся да выстаўкі» з мэтай шырокага азнаямленьня рабочых і сялян. Але брашура «Рыхтуйся да выстаўкі» да гэтага часу рыхтуецца Наркамземам. Адзінае, што зроблена,—гэта выданы загад аб складаньні камісіі на перасяленьні насельнікаў тэрыторыі выстаўкі і складзены сьпісы навільёнаў. Менгарсавет зацьвердзіў адвядзеньне тэрыторыі для выстаўкі. Вось амаль усё, што зроблена ўстановамі. Нават да гэтага часу не арганізаваны акруговыя выставачныя камітэты. НКЗ і ВСНГ не вядуць ніякай работы ў акругах у адносінах падрыхтоўкі экспанатаў і інш. мерапрыемстваў, зьвязаных з падрыхтоўкай выстаўкі.

Ня гледячы на гэткія нядбайныя адносіны, на няўважлівасьць да пабудовы і арганізацыі выстаўкі, на тыя труднасьці, пры якіх прыходзіцца весьці работу, дырэкцыя выстаўкі зрабіла многае.

— Праведзена ацэнка маемасьці і расплата з жыхарамі, якія перасяляюцца.

— Раскарчавана, падчышчана і падрыхтавана каля 30 гэктараў выставачнай тэрыторыі.

— Вызначаны месцы для пладовага саду, рассадніка для калекцый кармовых культур, гародніх і новых культур, шматпалёвых севазваротаў, зроблена разьбіўка севазваротаў, вывозіцца гной, апрацоўваецца глеба пад севазвароты, гэтымі днямі будзе засеяна канюшына.

— Скончана нівэліроўка тэрыторыі выстаўкі і складаюцца нівэліровачныя пляны.

— Праведзен конкурс на пабудову выстаўкі і зараз гэтыя праекты дэталізуюцца праектавальным бюро Белдзяржбуду.

СНК БССР зараз даў зусім выразную ўстаноўку пабудове выстаўкі і вызначыў суму на арганізацыю выстаўкі ў разьмеры аднаго мільёну рублёў.

Зараз трэба пасьпяшацца са складаньнем плянаў па цэнтральных установах і пэрыферыі. У плянах і кашторысах цэнтральных устаноў на 1929-30 год трэба прадугледзець сродкі на ажыцьцяўленьне мерапрыемстваў па арганізацыі выстаўкі. Трэба ўзьняць шырокую кампанію па папулярызацыі ідэй выстаўкі, кампанію за падрыхтоўку да выстаўкі, за уцягненьне спэцыялістых у падрыхтоўчую работу.

Да адкрыцьця выстаўкі (жнівень 1930 г.) засталося вельмі мала часу. Пастаноў і рэзалюцый па гэтым пытаньні досыць.

Трэба паглыбіць гэтую работу, трэба ўвязаць яе з правядзеньнем 5-цігадовага пляну сацыялістычнага будаўніцтва народнай гаспадаркі БССР.

А. ДУБІНА.

Хэмізацыя сельскай гаспадаркі БССР

Скарыстаць у 63 разы больш мінэральных угнаеньняў. — У працягу пяцігодзьдзя будзе вапнавана 750 тысяч гэктараў.—Усе 100 проц. пасеўнага матар'ялу павінны быць пратручаны.—Хэмія дапаможа перамагчы шкоднікаў сельскай гаспадаркі, якая траціць ад іх кожны год 35 мільёнаў руб.

У гутарцы з нашым супрацоўнікам намесьнік старшыні камітэту па хэмізацыі БССР т. **Натанзон** сказаў:

— Задачы, што высоўваюцца пяцігадовым плянам у галіне рэканструкцыі народнае гаспадаркі БССР, інтэнсыфікацыі і індустрыялізацыі сельскае гаспадаркі, узьняцьця прамысловасьці на больш высокую тэхнічную базу, настойліва патрабуюць уліку і скарыстаньня сучасных дасягненьняў навуковай тэхнічнай думкі. У зьвязку з гэтым, адно з першых месц павінны займаць пытаньні хэмізацыі народнае гаспадаркі ва ўсім шырокім іх абёме.

Праблема пашырэньня сырцовае базы для больш поўнага яе скарыстаньня, пераапрацоўка адкідаў, увядзеньне і ўжываньне больш удасканаленых і эканамічна больш выгодных тэхналёгічных працэсаў,—усё гэта высоўвае патрэбнасьць рашучага ўкараненьня заваяваньняў хэміі ў народную гаспадарку.

Хэмічная прамысловасьць, як і ўжываньне хэмічных прадуктаў у сельскай гаспадарцы, мелі ў даваенны час у БССР невялікае значэньне. Такое становішча ёсьць і зараз. Так, валавая прадукцыя хэмічнай прамысловасьці (без запалкавай вытворчасьці) у 1913 г. ледзь дасягала 1 проц. прадукцыі ўсёй цэнзавай прамысловасьці, а ў 1927-28 г. яе ўдзельная вага ў агульнай застаецца на нізкім узроўні (0,8 проц.). Даваеннае спажываньне мінэральных угнаеньняў на тэрыторыі БССР, па даных НКЗ, складала 21,7 тыс. тон у год, што дае каля 7 клгр. на гэктар пасеўнай плошчы; у 1927-28 г. колькасьць мінэральных тукаў на гэктар пасеўнай плошчы зьніжаецца да 4,2 клгр.

Пабудаваньне пэрспэктыўнага пляну ў частцы хэмізацыі народнае гаспадаркі БССР ідзе па лініі павышэньня вагі хэмічнай прамысловасьці і максымальнага насычэньня патрэбнасьці сельскае гаспадаркі хэмпрадуктамі.

У мерапрыемствах па ўзьняцьці ўраджайнасьці глебы, пашырэньня пасеўнай плошчы шляхам уцягненьня ў апрацоўку няўдобных і бросавых зямель, павялічэньня таварнасьці сельскае гаспадаркі і г. д., значную ролю адыгрывае ўзмоцненае спажываньне хэмічных прадуктаў у сельскай гаспадарцы як у выглядзе ўгнойваючых тукаў, так і для барацьбы са шкоднікамі і хваробамі с.-г. расьлін.

За пяцігодзьдзе намячаецца ўпесьці ў глебу БССР 2.323 тыс. тон мінэральных угнаеньняў: з 14,3 тыс. тон, ужытых у 1927-28 г. давесьці да 905 тыс. у 1932-33 г., г. зн. павялічыць у 63 разы. Пры гэтым угноеная плошча у першым годзе пяцігодзьдзя складзе 76 тыс. гэктар, а ў апошнім—або 62,2 проц. угнойваецца поўным угнаеньнем і 517 тыс. гэктар (37,8 проц.) толькі фасфарытуецца.

Адначасова пэрспэктыўным плянам намячаюцца шырокія мерапрыемствы па вапнаваньні глебы. За пяць год павінна быць заваснавана плошча ў 750 гэкт., у якую будзе внесена да 1,5 млн. тон вапны. Паколькі вапнаваньне зьяўляецца мерапрыемствам новым, якое патрабуе як вялікай практычнай работы, так і ўзмоцненай прапаганды яго сярод насельніцтва, плянам намячаюцца шырокія дасьледчыя работы на дасьледчых станцыях Тураўскай, Палескай, Віцебскай і інш., а таксама ў сялян-дасьледчыкаў. У першы год пяцігодзьдзя галоўны ўпор па вапнаваньні робіцца на аграмаджаны сэктар гаспадаркі.

Наступным мерапрыемствам па хэмізацыі сельскае гаспадаркі зьяўляецца ўжываньне хэмічных прадуктаў для барацьбы са шкоднікамі, якое мае вялікае эканамічнае значэньне ў сельскай гаспадарцы БССР. Вільготны клімат Беларусі спрыяе распаўсюджаньню шкоднікаў сельска-гаспадарчых расьлін. Страты ад шкоднікаў і хвароб па палявых культурах—15 проц., па садовых—25 проц. і па агародніх—25 проц. Страты павінны быць расцэнены ня менш, чым на 35 млн. руб. у год. Сюды не ўваходзяць пашкоджаньні ад масавых шкоднікаў, якія хаця і ня кожны год, але прыносяць усё-ж такі вялікія страты.

Для барацьбы са шкоднікамі саду і агароду за пяцігодзьдзе намячаецца ўжыць наступную колькасьць інсэктафунгісідаў: жалезнага купарвасу—2,5 тыс. тон, меднага купарвасу—5,3 тыс. тон, парыскай зеляніны—94 тоны і вапны 15 тыс. тон, агульным коштам да 3 млн. руб.

Пратручваньне пасеўнага матар'ялу да гэтага часу ў БССР слаба практыкавалася. У 1927-28 г. было пратручана толькі 3 проц. збожжавых культур, заражаных галаўнёй. Па пляне намячаецца давесьці пратручваньне заражанага збожжа да 100 проц. або 153 тыс. тон у 1932-33 годзе, на што за пяцігодзьдзе павінна быць выдаткавана 165 тон фармаліну па суму 234 тыс. руб.

МЕНСК

Перад пачаткам новага навучальнага году

Калі пачнуцца заняткі? Згодна пастановы праўленьня БДУ, заняткі на першых курсах факультэтаў БДУ пачнуцца з 15 верасьня. Заліковая сэсія будзе праводзіцца з 20-га жніўня па 10 верасьня.

Арганізаваны прыймовыя камісіі. Пры ўсіх факультэтах унівэрсытэту арганізаваны прыймовыя камісіі. Старшынёю факультэцкай камісіі мэдфаку назначаны праф. Кроль, пэдфаку—праф. Піотуховіч, праўгасу—праф. Вальфсон.

Выпускі студэнтаў. 15-га чэрвеня адбудзецца чарговы выпуск студэнтаў пэдфаку БДУ. Выпуск студэнтаў мэдфаку назначаны на 29 верасьня.

Камандыроўкі на каапэрацыйныя курсы. Белкаапсаюз атрымаў тры месцы на каапэрацыйныя курсы Цэнтрасаюзу ў Маскве. На вышэйшыя каапэрацыйныя курсы ў Ленінградзе Белкаапсаюз камандыраваў 4-х чалавек.

Сацыялістычнае спаборніцтва паміж унівэрсытэтамі. Праўленьне БДУ пастанавіла арганізаваць з новага навучальнага году сацыялістычные спаборніцтвы паміж БДУ і іншымі унівэрсытэтамі СССР.

Экскурсія студэнтаў у яўрэйскія калёніі Крыму

Для папулярызацыі ідэй АЗЕТ'у, ячэйка АЗЕТ пры БДУ, сумесна з студэнцкімі арганізацыямі наладжвае экскурсію ў яўрэйскія калёніі ў Крыме. 12 чал. экскурсантаў выедзе туды 13 чэрвеня. Удзельніці экскурсіі, калі вернуцца назад, прачытаюць рад дакладаў на прадпрыемствах гораду.

Склікаецца ўсебеларускі зьезд латышоў

На апошнім пасяджэньні Цэнтральнай нацкамісіі т. Думе дакладваў аб рабоце сярод латышоў, якія жывуць у Беларусі. 81 проц. латышскага насельніцтва каапэравані. У Беларусі ёсьць 6 латышскіх калгасаў; пры Беларускай Акадэміі Навук утворана латышская камісія; працуе 21 латышская школа.

Нацкамісія пастанавіла склікаць у верасьні ўсебеларускі зьезд латышоў. Пастанова нацкамісіі перадана на зацьвярджэньне ў ЦВК БССР.

На чаўне з Бабруйску ў Адэсу

У Менску арганізавалася студэнцкая турысцкая група, якая намеціла паездку па маршруце Бабруйск—Адэса—па чаўне, Адэса—Севастопаль—на параходзе, Севастопаль—Ялта—пяшком, Ялта—Батум—параходам, Батум—Баку—цягніком. Турыстыя выедуць з Бабруйску 20-21 чэрвеня. Праўленьня Белдзяржунівэрсытэту выдала турыстым 150 руб. Частка сродкаў адпушчана таксама ЦК Беларускага Чырвонага Крыжу.

Вялікі пажар на вёсцы

10 чэрвеня ў Менску атрымана паведамленьне аб вялікім пажары ў вёсцы Раўнапольле, Сьмілавіцкага раёну, недалёка ад Менску. Для ліквідацыі пажару з Менску ў 2 гадз. дня выехала ў Раўнапольле 2-я частка гарадзкой пажарнай каманды, якая вярнулася ў Менск а 8 гадзіне ўвечары. У ліквідацыі пажару прымалі таксама ўдзел некалькі каманд з бліжэйшых 3-х вёсак. Згарэла поўнасьцю 4 двары і 60 гумен. Па няпоўных вестках, страты дасягаюць каля 10 тысяч руб. Прычыны пажару высьвятляюцца.

За дзень

«Санітарны самалёт». Збор сродкаў на пабудову «Санітарнага самалёту» імя ЦК Чырвонага Крыжу працягваецца. Дагэтуль у фонд самалёту паступіла каля 7 тысяч рублёў.

Пленум ЦБ пралетстуду. 14-га чэрвеня ў Менску склікаецца чарговы пленум ЦБ пралетстуду Беларусі. Пленум заслухае даклады аб дзейнасьці ЦБ, аб падрыхтоўцы навуковых працаўнікоў і інш.

Дапамога беларускім вучням заграніцай. ЦК Чырвонага Крыжу Беларусі адпусьціў 100 руб. на куплю падручнікаў для вучняў Беларускай гімназіі у Дзьвінску (Латвія).

Геалёгічная экспэдыцыя. Для правядзеньня досьледаў карысных выкапняў—глін, вапны і інш. геалёгічны інстытут Беларускай Акадэміі Навук наладжвае пад кіраўніцтвам інж. Грабоўскага экспэдыцыю ў Аршаншчыну, у раён Дняпра.

У прэзыдыуме ЦВК

Арганізацыя сельскіх і местачковых бюджэтаў

Прэзыдыум ЦВК адзначыў нездавальняючае выкананьне акрвыканкомамі пастановы III сэсіі ЦВК БССР аб павялічэньні колькасьці сельскіх і местачковых бюджэтаў, а таксама недастатковы нагляд і кантроль з боку Наркамфіну за гэтай справай. Наркамфіну даручана дабіцца арганізацыі 2-3 самастойных сельскіх бюджэтаў у кожным раёне, з тым, каб агульная колькасьць сельскіх бюджэтаў па БССР складала ня менш 200-250. Акрвыканкомам даручана арганізаваць у кожным мястэчку самастойныя бюджэты.

Камісіі па паляпшэньні працы і быце жанчын

Прэзыдыум ЦВК пастанавіў арганізаваць пры выканкомам, сельскіх і местачковых саветах камісіі, а пры гарсаветах — сэкцыі па паляпшэньні працы і быту жанчын. Задачамі камісій (сэкцый) зьяўляецца ажыцьцяўленьне праз саветы і іншыя дзяржаўныя арганізацыі практычных мерапрыемстваў па перабудове быту працоўных жанчын, па падняцьці іх культурнага ўзроўню, па аказаньні ім юрыдычнай і эканамічнай дапамогі.

Арганізавана цэнтральная камісія па паляпшэньні быту жанчын

Прэзыдыум ЦВК зацьвердзіў склад камісіі пры прэзыдыуме па паляпшэньні працы і быту жанчын. Старшыня камісіі т. Хацкевіч, намесьнік старшыні—т. Крамер, члены—т. т. Анішчанка Захарава, Бэрлі на, Крузмат, Масюкоў Вайтэнка, Лукашэвіч, Граеўская, Лебедзева, Дубіна, Хаськін, Гохман, Дубіцкая, Жарын, Стракоўскі.

Новы склад Белкамзету

Прэзыдыум ЦВК зацьвердзіў Белкамзет у наступным складзе: т. т. Рачыцкі (старшыня), Баран (адказны сакратар), Бэйлін, Ашаровіч, Амбражунас, Аксючыц, Вансоўскі, Валодзька, Бунін, Будзін, Хацкевіч, Масюкоў, Карп, Карклін і Сьмірноў.

Па Савецкай Беларусі

3 новыя фасфарытныя заводы

Паўтара мільёны пудоў штучнага ўгнаеньня для сельскай гаспадаркі

Гэтымі днямі пушчаны ў ход **Мсьціслаўскі** фасфарытны млын, першае ў Беларусі прадпрыемства па вырабе ўгнойваючых фасфарытных тукаў. Адначасова пачынаецца будаўніцтва вялікага **Крычаўскага** фасфарытнага заводу і невялікага **Клімавіцкага** фасфарытнага млыну.

Усе паказаныя прадпрыемствы грунтуюцца на фасфарытнай рудзе, сотні мільёнаў пудоў якое ёсьць у раёне Мсьціслаўлю, Крычава і Клімавіч. Іх прадукцыя ў значнай ступені вырашыць патрэбнасьць у штучным угнаеньні сельскай гаспадаркі Беларусі.

У бліжэйшыя 2-3 гады можна і патрэбна давесьці прадукцыю гэтых прадпрыемстваў да 1½-2 мільёнаў пудоў мукі ў год, а ў наступным магчыма больш. Для пасьпяховага выкананьня гэтага заданьня трэба рашуча перамагчы ўсе перашкоды, што стаяць на шляху будаўніцтва гэтых новых прадпрыемстваў. Першая і галоўная перашкода—дастаўка руды да прадпрыемстваў.

Распрацоўка руды адбываецца ва Мсьціслаўлем, ля вішнявін ракі Сожу. Апошняя да самага Крычава і далей да Прапойску ў сэнсе судаходнасьці мала вывучана. Забалочанасьць, засьмечанасьць карчамі вось перашкода па шляху праходжаньня руд. Трэба гэтым летам гэту частку ракі, прыблізна да 70 кілёмэтраў, ачысьціць і прывесьці ў судаходны стан. Гэтым занялося кіраўніцтва Дняпроўскага Водашляху.

Трэба ўсім РВК і сельсаветам дапамагчы гэтай важнай рабоце.

Органы Наркамзему ў адпаведных раёнах павінны зараз-жа надзяліць зямлёю тых сялян, на землях якіх вядзецца здабываньне руды.

Трэба стварыць кадр рабочых-гарнякоў з бяднейшых груп вакольнага насельніцтва з уцягненьнем і местачковай беднаты. Трэба з самага пачатку прыцягнуць да гэтай важнай задачы ўвагу прафсаюзаў. Хуткае і правільнае будаўніцтва гэтых прадпрыемстваў, своячасовы пуск іх будзе лепшым адказам на пастанову 15-га партзьезду аб павялічэньні вырабу штучнага ўгнаеньня.

Трэба яшчэ гэтым летам канчаткова спраектаваць завод па пераапрацоўцы касьцяной мукі (эскізны праект ужо зацьверджаны) з такім разьлікам, каб у будучым годзе пачаць ужо будаваць яго.

МАР'ЯСІН.

Першыя на Беларусі калгасы на балоце

Трактарная калёна працуе ў дзьве зьмены

Палявыя работы ў балотным саўгасе імя «10-цігодзьдзя БССР» (Бабруйшчына) разгорнуты поўным тэмпам. Сёлета, згодна пляну, павінна быць засеяна 300 гэктараў ральлі і ўзьнята 2.200 гэктараў балотнай цаліны. На 1-га чэрвеня засеяна 122 гэктары і падрыхтаваны да посеву 41 гэктар цэлага балота. Работа вядзецца выключна трактарамі. Коні там не змаглі-б працаваць. На балоце працуе калёна ў 15 трактараў. Частка трактараў перайшла на дзьве зьмены. Адчуваецца недахват трактарыстых, што шкодзіць пераходу трактарнай калёны поўнасьцю на дзьве зьмены. Патрабуецца ня менш 10 трактарыстых. Стан пасеваў добры. У саўгасе канчаецца пабудовай вялікі дом на 10-12 кватэр, арганізавана сталоўка, ёсьць кіно-перасоўка.

Сёлета на Мар'інскім балоце арганізуюцца першыя на Беларусі калгасы на балоце—ўлярэйскі і з дэмабілізаваных чырвонаармейцаў. Кожнаму калгасу адводзіцца па 400 гэктараў плошчы. Частка членаў ўлярэйскага калгасу ўжо знаходзіцца на месцы і праводзіць раскарчоўку і расчыстку вучастку.

Будаўніцтва ільнакамбінату—перад пагрозай зрыву

ВОРША. (Наш кар.). Паўтары ўжо месяцы назад распачаўся будаўнічы сэзон, але да гэтага часу будаўніцтва ільнакамбінату яшчэ не разгарнулася. Тлумачыцца гэта тым, што Ўсесаюзны Тэкстыльсьндыкат ня даў канчатковай згоды на пачатак будаўніцтва, будаўнічы камітэт ВСНГ СССР затрымлівае зацьвярджэньне будаўніцтва. У сваю чаргу Белдзяржстрой не сьпяшаецца з будаўніцтвам: яшчэ да гэтага часу няма рабочых чарцяжоў і папярэдняга кашторысу будаўніцтва, не хапае патрэбнай колькасьці лесаматар'ялаў. Такім чынам будаўніцтва ільнакамбінату толькі пачынаецца, і мы стаім перад пагрозай зрыву будаўнічага сэзону. Прэзыдыум акрвыканкому зьвярнуў увагу Тэкстыльсьндыкату і Белдзяржбуду на дрэнная становішча будаўніцтва.

Працэс б. працаўнікоў папраўчага дому

ВІЦЕБСК. (Наш кар.). Акруговы суд пачаў разгляд справы б. працаўнікоў папраўчага дому, якія абвінавачваюцца ў разе злоўжываньняў.

Адкрыўся акруговы зьезд прафсаюзаў

МАЗЫР. (Наш кар.) Адкрыўся акруговы зьезд прафэсыянальных саюзаў. На зьезд зьявіліся дэлегаты ад 13 тысяч членаў саюзу. Прафарганізацыі за год узрасьлі на 16 проц., галоўным чынам за лік сельска-гаспадарчых рабочых.

Зьезд актыўна абгаварыў даклад ЦСПСБ.

Пачаўся летні спартыўны сэзон

МАЗЫР. (Наш. кар.). 8-га чэрвеня пры ўдзеле дэлегатаў акруговага зьезду прафсаюзаў адкрыўся летні спартыўны сэзон. У гарадзкім садзе адбыліся выступленьні футбалістых і баскетбольных каманд.

Узбуйненьне калгасаў

МАЗЫР. (Наш кар.). У апошні час у акрузе, побач з арганізацыяй новых калектыўных гаспадарак, праводзіцца ўзбуйненьне ўжо існуючых калгасаў. Так, у Каралінскім раёне да камуны «Праца» далучыўся Дзьвіжкаўскі калгас. У Юравіцкім раёне да калгасу Вялікія Вадовічы далучыўся калгас Малыя Вадовічы і г. д.

Што зроблена па заметках рабселькораў

⊙ **ЗЬНЯТ З ПРАЦЫ** за растрату і адданы пад суд старшыня Даманавіцкага с.-т. таварыства (Мазыршчына) П. **Зайцаў.** Справа выкрыта селькораўскай заметкай: «**Сваім салам да ня сваёй скуры**», пасланай на расьсьледваньне.

⊙ **ПАСТАНОВАЙ КАЛЕГІІ НК РСІ БЕЛ.** прыцягваюцца да адказнасьці працаўнікі Скурсьндыкату, вінаватыя ў безгаспадарчасьці, аб якой пісаў рабкор у заметцы: «**Аб чыноўніках з Скурсьндыкату і саляных плямах**», зьмешчанай у нашай газэце ад 21/XI—28 г.

⊙ **ЗЬНЯТЫ З ПРАЦЫ** ў Менстрахкасе **Федасеяў Н., Федасеяў А., Палтаржыцкі,** як былыя паліцэйскія. Справа выкрыта заметкай рабкора «**Хто дармова пажырае сродкі страхкасы**». Наконт іншых, паказаных у заметцы, справа высьвятляецца і будзе паведамлена дадаткова.

⊙ **ЗАГАДЧЫК МЛЫНУ** Т. Фаерман атрымаў адміністрацыйнае пакараньне за недагляд за млынарамі, якія ў часе працы п'янствавалі. Справа выкрыта заметкай селькора «**Ну і парадкі**», пасланай на расьсьледваньне ў Круглянскі РВК.

⊙ **БАРЫСАЎСКАМУ ГАРКОМУ ПАРТЫІ** пастаўлена на від за няўважлівае кіраваньне фракцыяй праўленьня ЦРК, дзе рабіліся растраты, а потым па падпісных лістох зьбіраліся грошы, каб пакрыць растрату. Растратчыкі зьняты з працы. Злачынства выкрыта заметкай рабкора «**Ганебная справа**», пасланай на расьсьледваньне ў **Мен. АКК.**

ПАВЕДАМЛЕНЬНІ

У пятніцу, 14 чэрвеня, а 6 гадзіне вечарам у залі пасяджэньня акругкому КП(б)Б склікаецца аб'яднанае пасяджэньне праўленьняў шэфскіх таварыстваў Кастрычнікавага і Фрунзэўскага раёнаў.

Парадак дня:

1. Выніні ваеннавой пасеўнай кампаніі і чарговыя задачы па налетывізацыі.

2. Арганізацыйныя пытаньні.

Яўка усіх членаў праўленьняў і рэвізійных камісій абавязкова.

Нарада камуністых—навуковых працаўнікоў з тав. ЗАТОНСКІМ адбудзецца ў сераду, 12 чэрвеня а 6 гадзіне вечарам у памяшк. Камвузу (габінэт ленінізму).

У пятніцу, 14 чэрвеня а 6-ай гадзіне ўвечары ў памяшканьні Фрунзэўскага РК КП(б)Б адбудзецца пасяджэньне камісіі па адбору кандыдатаў у ВЯЧЭРНІ КАМВУЗ.

Усім сакратарам альбо апоргам ячэек са сваімі кандыдатамі зьявіцца ў ФРК да азначанага часу. Апошні тэрмін здачы ў РК анкет кандыдатаў у вячэрні камвуз — чацьверг 13 га чэрвеня 1929 г.

—ДОМ АСЬВЕТЫ. Адкрыта дадатковая запісь на дзіцячую пляцоўку (3-ю групу); запісь — да 14 чэрвеня. Сёньня, 12 чэрвеня у саўзе—кіно «Капрыз Кацярыны II». Пачатак а 10 гадз.

—У пятніцу, 14 чэрвеня, у тэатры «Прафінтэрн» для сяброў саюзу працасьветы і медсанпрацы будзе пастаўлен спэктакль Ленінградзкім „Красным тэатрам" — камэд. В. Лебедзева «Хозяцевые штаны». Білеты па заяўках месцкомаў і групкомаў у саюзах.

Адказны рэдактар ЯН. АСЬМОЎ.

ТЭАТР і КІНО

Беладзяржтэатр.
Гастролі Ленінградзкага «Красного Театра».
Серада, 12 чэрвеня
„ПЬЯНЫЙ КРУГ" п'еса ў 3 дзеях, 14 эпізодах Д. Дэля
У чацьвер, 13 чэрвеня—адкрыты спэктакль „НАУГАД".
Пачатак а 8.з пал. гадз. увеч.
Білеты ў касе тэатру ад 5—8 гадз. увеч.

КІНО-ТЭАТР „Культура" — Сёньня і штодзённа МАСТАЦКІ БАЯВІК **Скрозь сьлёзы** кіно-апавяданьне у 7 ч. паводле твору ШОЛОМ-АЛЕЙХЕМА. Пач. роўна а 8 г. увеч. Каса—ад 6 гадз.

Кіно-сад ЧЫРВОНАЯ ЗОРКА Савецкая, 71. — Новы нямецкі баявік **ДОНА-ЖУАНА** 2 сэансы—пачатак 1-га а 9 г., 2-га а 10 г. 30 м. Каса ад 7 гадз.

КІНО Інтэрнацыянал — Мастацкі фільм **ЗЯМЛЯ КЛІЧА** у 6 частках. Пачатак 1-га сэансу а 7 з пал. гадз.

КІНО Пралетары — Мастацкі фільм **3-я маладосьць** арыгінальная камэдыя ў 6 частках. Пачатак сэансаў а 7 г. 30 м. Каса ад 6 г.

КІНО Спартак — **ВІЛЬЯМ ХАРТ** у новай амэрык. трука-прыгодніцкай кіно-фільме **РАСПЛАТА** (з-за жанчыны каханай) драма ў 7 частках. Каса—ад 6 г., пачатак 1-га сэансу а 7 г. 30 м.

Прыймо абвестак у чарговы нумар газэты адбываецца да 2-ое гадзіны дня

СЕРАДА, 12 чэрвеня

ДЗЯРЖЦЫРК

Выключная ў сэзоне праграма

1-шы раз у БССР заслуж. арт. рэспублікі Грузіі **Бр. ТАНЦІ**

1-шы раз у БССР сусьветны артысты **Максімільян ТРУЦЬЦІ**

Лепшая ў СССР трупа акрабатаў **10 ОКЕАНОС 10**

1-шы раз у БССР дзярж. стайня пад кіраўн. вядом. Італьянск. дрэсыр. **ДЖЫЯВАНІ** новая дрэсыроўка.

1-шы раз у БССР масквічы **АЛЬПЕРАЎ І МАКС** клёўны-сатырыкі у новым рэпэртуары.

Гастроль трупы **4 ЮЛІАНС 4**

Гастроль паветр. гімнастаў **2 СТЭФАНІ 2**

Гастроль турыстых **3 ЧАЙЧЭНКА 3** | Гастроль гладыятараў **2 АЛЬБЭРТ 2** | Гастроль (перш) **ДОН-ДЫЕГО**

Ля дывану—улюбенец публікі Чарлі Чаплін.

З прычыны грандыёзн. праграмы—пачатак роўна а 9 г. увеч.
Па заяўках фабзаўкомаў і мясцкомаў—СКІДКА.

КРЕМ МЕТАМОРФОЗ — ВЕСНУШЕК, КРАСНОТЫ, ЖЕЛТЫХ ПЯТЕН, ЗАГАРА, УГРЕЙ И ДР. НЕДОСТАТКОВ КОЖИ ЛИЦА. ЛУЧШЕЕ ИСПЫТАННОЕ СРЕДСТВО ПРОТИВ — КАЗИМИР

ВЫШЛА З ДРУКУ, рассылаецца падпісчыкам і паступіла ў продаж
ПЯТАЯ (за май месяц) КНІГА
„ПОЛЫМЯ"
ЗА 1929 г.
БЕЛАРУСКАЯ ШТОМЕСЯЧНАЯ ЧАСОПІСЬ ЛІТАРАТУРЫ, ПАЛІТЫКІ, ЭКАНОМІКІ, ГІСТОРЫІ, КРЫТЫКІ

ПАД РЭДАКЦЫЯЙ: З. ЖЫЛУНОВІЧА (адказны рэдактар), ЯНКІ КУПАЛЫ, А. НЕКРАШЭВІЧА, І. ШЫПІЛЫ, М. ЧАРОТА.

ЗЬМЕСТ: Васіль Каваль. Сіняя восень—*Апавяданьне*; Васіль Сташэўскі. Архангелы в тара); Яньк Колас. На шляхох волі—*Поэма* (працяг); Валеры Маранаў. Мая поэма (канец); Г. Гарацкі. Нацыянальная асаблівасьці насельніцтва БССР і беларускага насельніцтва СССР паводле перапісу 1926 г.; А. Цьвікевіч. Характарыстыка становішча Беларусі ў 80—90 гадох; М. Равіч-Чарнаскі. Нацыянальнае і калёніяльнае пытаньне ў ленінізме; Цішка Гартны. Дваццаць гадоў назад (*успаміны з мінулага*); М. Быкавец. Інстытут Тараса Шэўчэнкі; Кіігаціс—С. Л., А. Вазьнасенскі, Смаляціч; Хроніка беларускага культурнага жыцьця; Хроніка культурнага жыцьця украінскага культурнага жыцьця; Хроніка культурнага жыцьця замежных краін.

Прымаецца падпіска на часопісь „ПОЛЫМЯ" на другую палову 1929 году.

Гадавыя падпісчыкі на часопісь «ПОЛЫМЯ» атрымліваюць на падпісных квітках, пры пакупцы мастацкай і палітычнай літаратуры выданьняў БДВ у ўласных кнігарнях БДВ ільготы на агульную суму да 30 р.—скідку у 25 проц., а поўгадавыя на